Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны
музей-запаведнік

# матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі

(па выніках навукова-даследчай работы ў 2002 г.)



Полацк 2003

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛАЦКІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК

# МАТЭРЫЯЛЫ
## навукова-практычнай канферэнцыі

(па выніках навукова-даследчай работы ў 2002 г.)

Полацк 2003

ББК 63.3(4Беи)
М35

Друкуецца па рашэнню навукова-метадычнай рады НПГКМЗ

Адказны за выпуск: *М.М. Ільніцкі*
дырэктар НПГКМЗ

Укладальнік: *Т.А. Джумантаева*
намеснік дырэктара па навуковай рабоце

М35 **Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі** (па выніках навукова-даследчай работы ў 2002 г.). Полацк: НПГКМЗ, 2003. — с.152, іл.

27-28 лютага 2003 г. адбылася справаздачная канферэнцыя па выніках навукова-даследчай работы супрацоўнікаў запаведніка ў 2002 г. Тэматыка дакладаў ахапіла шырокае кола пытанняў, якімі займаюцца супрацоўнікі музеяў. Асаблівая ўвага надавалася навуковай апрацоўцы калекцый запаведніка. У 2002 г. была скончана работа па складанню каталога “Полацк на старых паштоўках”. Працягваецца праца па складанню яшчэ некалькіх навуковых каталогаў, і ў зборніку, які Вы трымаеце ў руках, прадстаўлены справаздачы асобных этапаў работы над каталогамі друкаваных выданняў, халоднай зброі, самавараў, кафлі і манет Рэчы Паспалітай. На канферэнцыі прагучалі паведамленні па гісторыі і архітэктуры Полацка, пабудаваныя на аснове архіўных матэрыялаў, археалагічных і архітэктурных даследаванняў.

**ББК 63.3(4Беи)+79.1(4Беи)**

Набор і макет выкананы на выдавецкім комплексе
Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка
**Камп'ютарнае макетаванне:** ***В.У. Гаўрылаў***

© Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, 2003

# Концепция природно-экологического музея в г. Полоцке

*Н.З. Беспрозванная*

Традиция коллекционирования животных и растений насчитывает много веков. В конце XVII – нач. XVIII вв. большую популярность приобрели естественно-исторические коллекции, в которых были представлены минералы, раковины, насекомые, чучела птиц и млекопитающих.

Главным критерием отбора были редкость и эстетическая ценность. Доступ в частные коллекции был ограничен, разделения на фонды и экспозицию не существовало, экспонировались все коллекции. Особо ценилась оригинальность подачи материала, которая определялась не научными или познавательными принципами, а эстетическими представлениями и выдумкой владельца.

В конце XVIII – первой половине XIX вв. на базе частных коллекций возникают частные и государственные музеи. Первые и наиболее известные из частных – музей Э. Левера и музей У. Баллона в Лондоне. Характер экспозиции в них мало отличается от того, что было в кабинетах натуральной истории или кунсткамерах. На принципиально иной основе создавались государственные естественно-исторические музеи (Британский музей, 1759 г., Лондон; Национальный музей естественной истории, 1793 г., Париж; Музей натуральной истории, 1820 г., Лейден; Зоологический музей в Берлине и др.) Главное их отличие от частных – разделение фондов и экспозиции. Эти музеи стали крупными хранилищами научных коллекций.

Углубление биологических знаний, появление новых теорий, эволюция общих представлений о живом ведут к появлению новых принципов экспонирования.

В настоящее время происходят значительные изменения в ориентации общества, даже если одни предпочитают жить в высокоавтоматизированном обществе, опирающемся на последние достижения науки и техники и новые виды энергии, а другие ратуют за более гуманное и “экологически чистое” будущее на основе уже сделанного человеком, накопленного им опыта и приобретенных знаний.

Музей создается для того, чтобы сохранять и представлять особую территорию города, страны, разъяснять проблемы, имеющие отношение к состоянию природы. Он должен стать местом, где становится очевидным, что проблемы сегодняшнего общества являются определяющими для концепции наследия.

Природа Полотчины – часть Белорусского Поозерья – края с живописной природой. Флора и фауна региона богата и разнообразна. В настоящее

время здесь, как и везде, существует немало проблем в сохранности этой красоты, богатства, а, главное, создании соответствующих условий для жизни человека.

В целом Полотчина характеризуется как регион с довольно напряженной экологической ситуацией, высокой степенью концентрации производства и освоенностью территории. Большое влияние на состояние окружающей среды в регионе оказывает промышленный Новополоцк – город, в котором промышленных предприятий сконцентрировано столько, сколько бы полагалось иметь всего в республике.

И все же регион остается богатым на леса и водоемы. Несмотря на то, что леса занимают немалую площадь, вызывает тревогу и то, что в последние годы интенсивно беднеют лесные ресурсы по причине геохозяйственной деятельности человека, его варварскими отношениями к природным ресурсам. Наблюдается тенденция к уменьшению богатой и разнообразной фауны в лесах.

Все проблемы можно решить только совместными усилиями всех заинтересованных служб. Успех и быстрота решения экологических проблем зависят от того, насколько экологически грамотно будет современное человечество.

Человека в любом возрасте тянет на природу. Но не всем и не всегда удается побывать в лесу, у водоема, а, тем более встретиться с их “населением”. Частично эту проблему решают музеи природы.

В настоящее время музейная практика и экспозиционные принципы подавляющего большинства музеев природы и культуры Беларуси носят архаические черты. Отсутствие новых подходов к методологии и дизайну музейного собрания становятся угрозой провинциализации музеев республики. Традиционный подход к музеям природы рассматривает их как пассивную иллюстрацию к “школьному” курсу биологии, основанному на эволюционно-дарвинском взгляде на мир.

Однако концепции природы на рубеже XX-XXI вв. стали существенно объемнее и радикально отличными от прежних взглядов.

Во-первых, место эволюционной теории занимают более глубокие концепции природно-человеческого космоса, в которых находит отражение космогоническое единство человека и природы. Во-вторых, современное видение природы неразрывно связано с взаимодействием чисто природной среды с урбанизированной.

В-третьих сам взгляд на природу стал драматичнее, что связано с ощущением эко-культурной катастрофы.

Традиционный музей не в состоянии способствовать распространению этих идей.

Создаваемый природно-экологический музей предполагается разместить в водонапорной башне, здание которой находится на северной границе ядра исторического центра Полоцка в окружении застройки 1950-1970 гг., разорвавшей визуальные связи между музеем природы и основными зданиями заповедника.

Естественно-экологический музей должен “вписаться” в контекст Заповедника, имеющего прежде всего архитектурную и историко-археологическую направленность, но в то же время иметь собственный образ и обладать определенной уникальностью.

Водонапорная башня была построена в начале 50-ых годов из силикатного кирпича. В декорации фасадов использованы формы и детали из арсенала оборонной архитектуры Италии времён Ренессанса.

Сооружение высотой 32,7 м., диаметр башни – 8 м. Внутри башни расположена металлическая лестница, состоящая из 2-ух наружных и 2-ух внутренних поперечных рам. Эвакуационная лестница представляет собой многоярусную этажерку. С каждого уровня структуры предусмотрен эвакуационный выход на наружную лестницу. Технологические движения экскурсий происходят снизу вверх. В башне 5 экспозиционных уровней. Заканчивается экспозиция планетарием.

Основная идея экспозиции – показать природу как ценность и часть человеческого существования, а человека – как часть природного космоса.

Предполагается развернуть экспозицию как грандиозную панораму природного космоса в многообразии его отражений (искусстве, мифологии, поэзии). В основу экспозиции положен конфликт человека с природой, эффективное освоение природы человеком.

Экспозиция строится таким образом, что вначале человек попадает в освоенную природу и идет к неосвоенной.

В результате деятельности современного человека природа изменилась, стала предметом накопления. Человек занял доминирующее положение в природе, он захватил все и во многом нарушил равновесие в природе.

Жилище современного человека (а так называется первая тема экспозиции) комфортно, уютно. В разных видах присутствует в нем природа. Предполагается показать преобразованную человеком природу (сцены охоты, определенные виды производства, изготовление украшений, добыча и др.), а также жилище человека как символ изолированности. Из “жилища” зритель попадает в освоенную природу. Природа стала товаром, а человек – активным, умным, жадным существом. Из кладовой природы – в склады, амбары, кладовки. Человек захватил доминирующее положение в природе и отражение этого права силы живет в нашей природе. Он ведет

себя хуже всех остальных живых существ, причиняет больше всего ущерба окружающей среде.

Наделенный достаточным умом, он обратил его на изобретение эффективных способов калечения и уничтожения природы. Не понимая пагубности своих действий, человек часто сокращал запасы именно того ресурса, который представлял для него наибольшую ценность.

Уничтожая одни виды, человек способствовал развитию других, более жизненных.

Человек, являясь составной частью природы, забыл об этом. Активно преобразуя ее, он не задумывался о последствиях такого преобразования.

Антропогенная деятельность человека больше всего затронула флору и фауну суши. Таким образом многие виды растений и животных оказались полностью уничтоженными. Еще большее количество находится на грани исчезновения. На огромных площадях вместо уничтоженной дикой растительности раскинулись с/х угодья.

Данный раздел будет посвящен месту человека в этом мире, где накопленные им духовные ценности и “позитивы” культуры сложным образом соотносятся с атрибутами и “негативами” цивилизации. Посетитель становится свидетелем ухода натуральных естественных отношений и ценностей, вытесняемых не только продуктами человеческой деятельности, но и непосредственно с ней связанными жёсткими конструкциями нашего сознания.

Сквозь драматически звучащую тему надвигающейся катастрофы, зритель постепенно поднимается к той части экспозиции, где представлены формы дикой, нетронутой человеком природы и образы мировой гармонии.

Экспозиция строится как развитие человеческого взгляда на мир, в который органически входят образы природы.

Предыдущий раздел экспозиции сменяет уголок потерянного рая. Человек и зверь равны перед творцом.

В финале осмотра, где муляжи природы, окружающие современного человека, завершают экспозицию, зритель должен определить свой дальнейший выбор; идти ли к более удобному, комфортабельному и вполне доступному миру благополучия, или осознать свою ответственность перед другим – более сложным, нерасторжимым и целостным, где природные и духовные ценности необходимо охранять и в их естественном, гармоничном сочетании.

Тем самым образ природы неразрывно связывается в экспозиции с нашим собственным миром.

Для реализации концептуальных идей в экспозиционном пространстве башни должно быть создано яркое впечатляющее зрелище – инсталляции,

или своего рода “театральное представление” декорациями которого станет экспозиционное оборудование.

Каждый момент экспозиции сопровождается звуком. Звучание предусмотрено через определённый интервал. Одна тема сменяет другую. Многие птицы имитируют звуки человеческой деятельности. Звуков птиц меньше, чем звуков города. Меньше, вообще, природных звуков.

Основная функция музея – экспонирование. Но, в то же время, музеи природы призваны играть особую роль. Они являются важнейшими учебными центрами, активно участвуют в проведении исследований, занимаются собирательской деятельностью, преподаванием и служат интересам общества.

Неплохо бы иметь при музее галерею “Райский сад” – постоянно действующую экспозицию произведений анималистического искусства, в которой графика, живопись и малая пластика экспонировались бы вместе с живыми растениями и животными.

Музей призван осуществлять широкую просветительную программу в области биологии и экологии. Она должна включать в себя тематические, учебные экскурсии для детей различного возраста.

Планируется иметь детский зал или “Семья в музее”, который в течение учебного года по субботам предлагал бы экскурсии выходного дня по залам музея, просмотр видеофильмов по тематике музея, цикл занятий “скорая помощь”, открытый показ фондовых коллекций, например, как муляжей грибов, коллекцию минералов, экзотических растений, насекомых и др., сопровождаемых консультациями музейных сотрудников. Здесь же должна быть предусмотрена практическая работа с микроскопами по изучению мелких живых объектов с комментариями музейного сотрудника, участие в биологических играх для взрослых и детей, проводимых по оригинальным сценариям с целью ненавязчивого обучения биологии и умению самостоятельно извлекать информацию из музейной экспозиции.

Прилегающая к музею территория не благоустроена. В будущем предполагается продолжить музейную экспозицию в прилегающее пространство. Планируется, например, иметь огород, где выращивались бы давно исчезнувшие культуры.

Музей природы создается на небогатой веществоведческой базе. Сегодня в фондах музея имеются: коллекции насекомых, моллюсков, гербарный материал, определенное количество чучел птиц и млекопитающих, рыб, черепов животных, шкуры животных.

Первые экспонаты для будущего музея были приобретены более десяти лет тому назад. Из-за отсутствия соответствующих условий хранения они пришли в непригодное состояние.

В настоящее время комплектование будущей экспозиции отсутствует по ряду причин.

И, тем не менее, в фондах Заповедника имеется коллекция природных материалов, которые и составят будущую экспозицию.

Большую часть коллекции составляют насекомые – 2420 ед. Основная часть коллекции – представители разных отрядов – собрана студентами Витебского пединститута на территории Витебской области в конце 1980-ых годов.

Коллекция жужелиц – 416 ед., приобретена у коллекционера Солодовникова И.А. (г. Витебск). Имеется коллекция насекомых, занесенных в Красную книгу – 27 ед., приобретенная у Солодовникова И.А. (г.Витебск). Предметы поступили в коллекцию путем сбора и обмена между коллекционерами. Коллекцию составляют представители фауны республик Закавказья.

Большую часть всей коллекции составляют Чешуекрылые (бабочки). Среди них как представители местной фауны, так и экзотических мест обитания. Коллекцию насекомых планируется использовать как выставочный материал и использовать его в учебных и научных целях.

Определенную часть коллекции составляют чучела животных-представителей фауны Поозерья – дикого кабана, косули, волка, хоря, горностая, белки, ежа и др. Всего таких представителей 28 ед. В состав коллекции входят также шкуры животных – 10 ед., рога, черепа, кости или фрагменты костей в количестве 43 ед.

Коллекция чучел птиц составляет 167 ед. Большая часть коллекции представлена работами таксидермиста Сухова Г.Н., работами студентов Витебского пединститута (конец 1980-х гг.), а также работами витебских таксидермистов Радкевича Д.В., Акулова А.Н. Наумчика А.В. Имеются работы ООО “Лимнофилл” г. Минск. Дополняют эту коллекцию птичьи гнезда и птичьи яйца, соответственно 42 и 59 ед.

Незначительную часть коллекции составляют рыбы, примерно, 10ед. Следует отметить то, что чучела рыб сложно изготовить и они не подлежат длительному хранению.

Коллекция моллюсков составляет 232 ед. В нее входят представители Поозерья.

Многообразно и в большом количестве представлен растительный материал в виде гербариев. Но большей частью это старый материал, срок хранения которого составляет более 15 лет, или не совсем качественно и эстетично оформленные студенческие работы.

Как выставочный материал он не может использоваться, но в учебных целях может найти применение.

# Перспектывы развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка

*Т.А. Джумантаева*

## 1.1. Музеефікацыя гістарычнай часткі горада

Музеефікацыя помнікаў – гэта спецыфічны напрамак музейнай дзейнасці. Яе сутнасць у пераўтварэнні нерухомых помнікаў гісторыі і культуры (і прыродных аб'ектаў) ў аб'екты музейнага паказу з мэтай актыўнага ўключэння ў сучасную культуру пры ўмовах максімальнага захавання, выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай і эстэтычнай каштоўнасці.

Тэрмін "музеефікацыя помнікаў" /**7**/ зацвердзіўся ў айчыннай музеялогіі ў 1950-1960 гг. падчас арганізацыі першых на тэрыторыі СССР музеяў-запаведнікаў і буйнамаштабных работ па рэстаўрацыі культурнай спадчыны. У1970-1980 гг. музеефікацыя пачала прадугледжваць не толькі даследаванне, кансервацыю, рэстаўрацыю, захаванне і інтэрпрэтацыю помніка, але ў выключных выпадках і навуковую рэканструкцыю страчаных частак.

У план музеефікацыі Полацка запаведнікам былі ўключаны асобныя помнікі як архітэктуры, так і археалогіі. Усе яны маюць высокі ўзровень інфармацыйнага патэнцыялу. Паняцце "інфармацыйны патэнцыял" музейнага прадмета (рухомага і нерухомага) ўключае ў сябе як вядомую інфармацыю аб прадмеце, яго "інфармацыйнае поле", так і схаваную. Інфармацыйнае поле музейнага прадмета вядома даследчыку ў сцёртым, збяднелым выглядзе, але ў працэсе працы з помнікам яно можа быць нарошчана з улікам пошуку "прывязкі" да пэўнага гістарычнага працэсу, выяўлення знакавых функцый аб'екта, устанаўлення асаблівасцяў, дэталяў, падрабязнасцяў, звязаных з яго бытаваннем; гэта значыць, атрымання "інфармацыйнай дакладнасці". Найбольш паспяхова гэты працэс ажыццяўляецца пры вывучэнні рэчаў у комплексе. Першапачаткова музей-запаведнік уяўляе сабой комплекс сувязяў, захаваўшыхся (у той ці іншай ступені) паміж асобнымі помнікамі, што дае аптымальныя магчымасці як для выяўлення і нарошчвання інфармацыйнага поля кожнага прадмета, так і для ўзнаўлення цэльнага  і дакладнага вобраза эпохі, культуры, асобы. Дакладны вобраз нараджаецца толькі ў тым выпадку, калі інтэрпрэтацыя пачынаецца ўжо на стадыі музеефікацыі і ўся тэрыторыя запаведніка атрымлівае асэнсаванне як складаная, але адзіная экспазіцыя. Гэта ўмова набывае асаблівую важнасць там, дзе значная частка помнікаў страчана і сувязі паміж імі разарваны. Узнаўленне гэтых сувязяў, адраджэнне музейнымі сродкамі вобразаў мінулых эпох і культур, нарошчванне інфармацыйных палёў становіцца

важнейшай задачай музеефікацыі, а задача гэта тым больш складаная, чым больш багатыя і разнастайныя сувязі былі страчаны ў мінулым.

Такім чынам, галоўнай канцэптуальнай мэтай запаведніка з'яўляецца паслядоўная палітыка музеефікацыі гістарычных раёнаў і цэнтра Полацка на прынцыпах унікальнай гістарычнай тэрыторыі.

Аднак пад аховай дзяржавы знаходзіцца толькі частка тэрыторый, яшчэ меншы абшар ахоплівае ахоўная зона запаведніка, але, як лічаць спецыялісты, музеефікацыя полацкага гістарычнага цэнтра ў яго фактычных межах магчыма /**2**, с. 7-8/. Тым больш, што неабходнасць музеефікацыі гістарычных аб'ектаў унікальнай тэрыторыі Полацка не выклікае сумнення.

Работа ў гэтым напрамку вядзецца даўно, хоць раней музеефікацыя тычылася галоўным чынам асобных аб'ектаў – у першую чаргу археалагічных рэшткаў сярэднявечных пабудоў.

Паказальнай з'явай працэса музеефікацыі асобнага помніка стаў Сафійскі сабор. Для яго музеефікацыі быў праведзены цэлы комплекс мерапрыемстваў:

- рэстаўрацыя будынка пасля архітэктурна-археалагічных даследаванняў;
- кансервацыя і частковая рэстаўрацыя фрэсак канца XI ст., якую праводзіла брыгада Спецыяльных навукова-вытворчых майстэрань Міністэрства культуры БССР на чале з рэстаўратарам В. Лукашэвічам /**10**, с. 14/;
- стварэнне экспазіцыі Музея гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора ў двух залах, уключаючы падвал;
- стварэнне ўмоў для неабходнага тэмпературна-вільгаснага рэжыму;
- стварэнне ўмоў для выкарыстання акустыкі будынка;
- усталяванне аргана і размяшчэнне канцэртнага абсталявання.

У музеі спалучаецца паказ фрагментаў муроўкі, што належыць да розных этапаў будаўніцтва сабора, пачынаючы з сярэдзіны XI ст., з агульнай прасторавай структурай інтэр'ераў помніка. У сукупнасці гэтыя фрагменты, археалагічныя знаходкі і дапаможны матэрыял (у выглядзе чарцяжоў, слайдаў і макетаў) уяўляюць сабой арганічную экспазіцыю ў прасторава-пластычнай структуры помніка. Такая экспазіцыя валодае пазнавальным патэнцыялам, не патрабуе ўвядзення складанага музейнага абсталявання і аб'ёмнай тлумачальнай эксплікацыі, а таксама не парушае архітэктурнага вобраза будынка.

У ходзе работы над кожным з асобных аб'ектаў мы часта вымушаны пераглядаць першапачатковыя мэты і ідэі. Трактоўка музейнага значэння архітэктурнага помніка ў працэсе музеефікацыі павінна дапускаць "адкрытую" даследчую пазіцыю. З'ўленне новых гістарычных і навуковых

фактаў можа быць крыніцай фарміравання новых музейных функцый архітэктурнага помніка. Значэнне музеефікацыі помнікаў архітэктуры павялічваецца неабходнасцю захаваць гістарычны архітэктурна-горадабудаўнічы асяродак ва ўмовах гарадоў якія растуць і развіваюцца. Сёння мала забяспечыць фізічную захаванасць помніка, яго неабходна ўключыць у агульны кантэкст духоўнай і матэрыяльнай дзейнасці. Тым больш, што існуючы вопыт і практыка паказалі, што ў нашых умовах ні выяўленне, ні ўлік, ні ахова дзяржавы не могуць забяспечыць захаванне нерухомых і рухомых помнікаў як нацыянальнай спадчыны. Кропкавыя аб’екты можна захоўваць і выкарыстоўваць толькі ў пэўным асяроддзі.

Таму неабходна разглядаць магчымасць музеефікацыі ўсяго гістарычнага цэнтра Полацка як адзінага цэлага. Але практычна гэта магчыма толькі на грунце канцэпцыі ўнікальнай гістарычнай тэрыторыі, пра распрацоўку прынцыпаў каторай размова ідзе аж з 1995 г.

У Беларусі існуе тып унікальнай гістарычнай тэрыторыі – гэта гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі. Запаведнік уяўляе сабой аб’ект, дзе ў традыцыйным прасторавым і сацыяльна-культурным асяроддзі знаходзяцца прыродныя і гісторыка-культурныя аб’екты выключнай каштоўнасці і вартасці. Гэта комплекс помнікаў і тэрыторый, звязаных этнічнымі, эканамічнымі, гістарычнымі і геаграфічнымі фактарамі /**3**, с.14/.

У сітуацыі сучаснага Полацка, калі ўлічваць магчымасць аб’яднання з Наваполацкам, можна разглядаць тры варыянты будучыні гістарычнага цэнтра /**2**, с. 7/:

- цэнтр аб’яднаных гарадоў размяшчаецца па-за межамі гістарычнага цэнтра Полацка;
- цэнтр размяшчаецца часткова побач з гістарычным цэнтрам;
- цэнтр размяшчаецца на месцы сучаснага цэнтра Полацка.

Сучасны змест паняцця “культурная спадчына” звязаны з усім створаным чалавекам асяроддзем і разглядаецца ў сусветным экалагічным кантэксце. У мінулым перавагу аддавалі толькі найважнейшым помнікам і асобным творам мастацтва. Разбурэнні другой сусветнай вайны і наступствы індустрыяльнага развіцця (пачынаючы з 1950-х гадоў) прымусілі людзей усвядоміць шчыльную сувязь нашага жыцця з навакольным асяроддзем. У сучасным свеце існуе сталая тэндэнцыя усведамляць культурную спадчыну як змесціва ўсіх дакументальных сведчанняў жыццядзейнасці і дасягненняў чалавечага бытавання ў часе.

Паколькі беларускае заканадаўства не вызначае “гістарычны горад” як аб’ект захавання і не рэгламентуе дзейнасць па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны ў гэтым напрамку, неабходна звярнуцца да дакументаў аўтарытэтных міжнародных арганізацый. У

адпаведнасці з “Вашынгтонскай хартыяй”, захаванню падлягаюць не асобныя аб’екты – будынкі ды паркі, а характэрныя для канкрэтнага гарадскога абшару асяродавыя якасці, якія улучаюць гістарычны характар горада. Ён выяўляецца ў наступных элементах, якія складаюць адно цэлае:

“а) устойлівая планіровачная структура горада, вызначаная вуліцамі і зямельнымі пляцамі;

б) суадносіны паміж будынкамі, азялененымі і адкрытымі прасторамі;

в) фармальны выгляд будынкаў (інтэр’ер і экстэр’ер), вызначаны праз маштаб, стыль, памер, канструкцыю, матэрыялы, колер і дэкор;

г) сувязь горада або гарадскога абшару са сваім прыродным і рукатворным навакольным атачэннем;

д) разнастайныя функцыі, якія горад або гарадскі абшар набылі з цягам часу” /**1**, с. 39-40/.

Вашынгтонская хартыя сцвярджае, што любая пагроза гэтым якасцям будзе кампраметаваць аўтэнтычнасць гістарычнага горада або гарадскога абшару.

У Законе “Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”, Глава IV “Гістарычна-культурныя музеі-запаведнікі”, артыкул 18 (адзіны ў гэтай Главе), канстатуецца, што “ансамблі і комплексы нерухомых гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія маюць асаблівую гістарычную, навуковую, мастацкую або іншую культурную значнасць, рашэннем Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць быць аб’яўлены гістарычна-культурнымі музеямі-запаведнікамі”/**4**/; што юрыдычны статус для кожнага асобнага запаведніка вызначаецца законам (?) і што ахова запаведнікаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны”. Нічога не сказана ў Законе аб унікальных гістарычных тэрыторыях, аб рэгламентаванні дзейнасці на тэрыторыі запаведніка і, ўвогуле, аб тым, што такое гісторыка-культурны запаведнік на самой справе.

Таму цалкам слушнымі ўяўляюцца вызначэнні паняццяў “музей-запаведнік” і “тэрыторыя музея-запаведніка”, якія дае вядомы музеёлаг А.М. Калбаска: “Музей-запаведнік – гэта комплекс помнікаў прыроды, гісторыі, культуры разам з тэрыторыяй, на якой яны знаходзяцца, што ўяўляе ўнікальную гістарычную, навуковую і культурную каштоўнасць. Музеі-запаведнікі могуць быць: біясфернымі, прыроднымі, культурнымі, гісторыка-архітэктурнымі, гісторыка-археалагічнымі і інш. Тэрыторыя, якую займае музей-запаведнік, выключаецца з сельскагаспадарчага ці іншага гаспадарчага выкарыстання і перадаецца яму на правах карыстання ў парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. На адведзенай для музея-запаведніка тэрыторыі забараняецца дзейнасць, якая супярэчыць яго функцыянальнаму прызначэнню і можа негатыўна

ўплываць на стан захавання комплексу, а таксама іншая дзейнасць, не сумяшчальная з дзейнасцю музея як установы культуры.

На гэтай тэрыторыі адпаведна статуту музея-запаведніка могуць быць вылучаны зоны: *запаведная* – для захавання і аховы найбольш каштоўных гісторыка-культурных, прыродных ці іншых комплексаў; *экспазіцыйная* – для стацыянарнага экспанавання буйнамаштабных музейных прадметаў і выкарыстання ў культурна-пазнавальных мэтах; *навуковая* – для правядзення навукова-даследчай дзейнасці; *рэкрэацыйная* – для адпачынку і абслугоўвання наведвальнікаў музея; *гаспадарчая* – для размяшчэння дапаможных гаспадарчых аб'ектаў. /**6**, с. 16/ Несумненна, гэтыя паняцці павінны стаць юрыдычнымі нормамі, калі мы дбаем пра захаванне нацыянальнай спадчыны.

Як і звычайнаму музею, музею-запаведніку ўласцівы ўвесь набор традыцыйных музейных функцый: адбор, захаванне, вывучэнне і прэзентацыя. У адрозненні ж ад традыцыйнага музея, ў сістэме каардынат запаведніка пашыраецца сэнс такіх музеялагічных паняццяў, як “музейны прадмет” і “прэзентацыя”. Музейным прадметам тут можа быць помнік архітэктуры, рамяство, мова, свята, царква ..., – усё, што бытуе і бытавала ў пэўным асяроддзі, што трэба ратаваць ці адрадзіць, захаваць і прэзентаваць – не проста прадэманстраваць знешні выгляд, а вярнуць ці ўключыць у плоскасць рэальнага існавання. Другім адрозненнем музея-запаведніка з'яўляецца абавязковая наяўнасць пэўнай тэрыторыі з людзьмі, якія хочуць у гэтым працэсе браць непасрэдны ўдзел.

На пачатку трэцяга тысячагоддзя нашай эры ўсё больш усведамляецца значнасць гістарычнай спадчыны. Полацку пашанцавала захаваць шэраг помнікаў у іх аўтэнтычным асяроддзі. У сувязі з гэтым у горада ёсць будучыня ў сэнсе адраджэння. На першым этапе гэтага працэсу магчыма адраджэнне Полацка ў яго новым гістарычным і культурным гучанні, у сэнсе прызнання яго імя тысячамі людзей. Не апошнюю ролю ў гэтай справе адыгрываў і паспяхова працягвае адыгрываць Полацкі запаведнік. Місія запаведніка вызначаецца ў аб'яднанні мэт на шляху захавання нацыянальнай культурнай спадчыны і інтэграцыі суседніх нацыянальных культур.

Прагнучы дасягнення мэты, трэба разумець, што развіцця аднаго запаведніка мала. Неабходна памятаць пра іншыя складальнікі поспеху. Вядома, што развіваючы толькі запаведнік, мы будзем сустракацца з праблемамі. Напрыклад, прадпрымальнік не заўсёды прыме да ўвагі ўмовы рэстаўратара і г.д. Розныя падыходы галіновых спецыялістаў будуць аб'ектыўна ствараць супярэчнасці. Таму галоўнымі складальнікамі поспеху любой справы, а ў дадзеным выпадку – здзяйснення канцэпцыі развіцця горада і запаведніка, з'яўляюцца: культуралагічная, эканамічная і

прававая. Апошняя мала паддаецца ўпраўленню, тым больш, што сучаснае заканадаўства пакуль недасканалае, і таму трэба ў першую чаргу засяродзіць увагу на першых двух складальніках.

Зыходзячы з практыкі, безумоўна прыярытэтным трэба лічыць культурна-гістарычны аспект. Сувязной тэмай, стрыжнем любой сённяшняй стратэгіі адраджэння Полацка з'яўляецца гісторыя ўнікальнай тэрыторыі, таму неабходнасць яе далейшага даследавання, вывучэння, захавання і музеефікацыі не выклікае сумнення.

Адным з эканамічных складальнікаў канцэпцыі развіцця Полацка і запаведніка з'яўляецца наведвальнік (гэта самае слабае звяно айчыннай музейнай справы). З вопыту расійскіх і іншых замежных культурных комплексаў, незалежна ад іх профілю, можна сцвярджаць, што асноўнымі для наведвання з'яўляюцца сацыяльныя і дзейныя матывы – імкненне да зносін і дзейнасці; пазнанне і задавальненне цікаўнасці і прафесійны інтарэс; узбуджанасць і творчасць.

Раней музеі не клапаціліся аб аптымізацыі свайго існавання, але сёння, каб пазбегнуць поўнага фінансавага краха, ім неабходна карыстацца метадамі маркетынга, шукаць спонсараў, пашыраць свае грамадскія сувязі.

Зараз у структурах музеяў з'яўляюцца новыя падраздзяленні, мэтай якіх стала інфармацыйная камунікацыя. Традыцыйная музейная лексіка папоўнілася новымі паняццямі: рынак, маркетынг, менеджмент, рэклама. Яны заклікаваны стаць пасрэднікамі ў прэзентацыі ўсіх праграм музея, адрасаваных публіцы, тлумачачы, што музей ідзе насустрач патрабаванням і імкненням наведвальнікаў.

Наладжванне трывалых сувязей з пастаяннымі кліентамі набывае першараднае значэнне. Музеі, нарэшце, усвядомілі, што яны не могуць супрацоўнічаць толькі з наведвальнікамі-турыстамі, а павінны знайсці пастаянных партнёраў сярод мясцовага насельніцтва.

Музей прызваны фарміраваць культурны асяродак той мясцовасці, дзе ён знаходзіцца. Музейная работа накіравана на выхаванне такога важнага пачуцця, як самасвядомасць. Праз свае выставы, экспазіцыі і мерапрыемствы музей звяртаецца асабіста да кожнага наведвальніка. Ён эмацыянальна ўздзейнічае на аўдыторыю і пры гэтым адукоўвае і выхоўвае яе.

Тое, што робіць музей – ёсць маркетынг культуры. Ён павінен улічваць інтарэсы ўсіх наведвальнікаў, сваіх супрацоўнікаў, спонсараў, прадпрымальнікаў... Але асноўнай мэтай застаецца прыцягненне ў музей новых асоб. Дасягнуць гэтай мэты музею могуць дапамагчы яго партнёры ў масавай камунікацыі:

- сродкі масавай інфармацыі,

- іншыя ўстановы культуры,
- школы і універсітэты,
- установы турызму, спорту і аховы здароўя.

Другое базавае палажэнне маркетынгавай палітыкі – сегментаванне рынка, у нашым выпадку – турыстычнага, прафесійнага і рынка мастацтваў.

Развіццё турысцкай індустрыі зараз лічыцца адной з прыярытэтных галін эканомікі. Важным напрамкам дзяржаўнага рэгулявання турыстцай дзейнасці з'яўляецца падтрымка і развіццё турызму ў межах нашай краіны /**5**, с. 4-12/.

Прафесіяналаў прываблівае навуковая работа і музейнае будаўніцтва, ці праграмы навучальных устаноў, ці краязнаўства ў шырокім сэнсе слова. Дзейнасць на рынку мастацтваў ускладняецца канкурэнцыяй горада Віцебска і таму, побач з гандлем (мастацкія салоны), больш спрыяльнымі трэба лічыць доўгатэрміновыя мэтавыя праграмы (напрыклад, стварэнне творчых атэлье ці майстэрань, вытворчасць прадметаў мастацкіх промыслаў і г.д.).

Адной з адметных асаблівасцей Полацкага запаведніка з'яўляецца яго дзейнасць у сферы нематэрыяльнай вытворчасці. Яе аснову складаюць розныя паслугі, хаця вынікі некаторых з іх могуць быць прадстаўлены і ў якасці тавараў.

Важна падкрэсліць, што агульнае развіццё матэрыяльнай культуры і дзейнасць запаведніка асобна – гэта працэс бесперапынны. На думку эканамістаў, да такіх працэсаў прыёмы прагназавання непрыдатныя. Такім чынам, для далейшай прапрацоўкі канцэпцыі развіцця горада і запаведніка неабходны іншы метадычны інструментарый, напрыклад, сцэнарый.

Сучасная музеялогія вызначае сцэнарную кампазіцыю як літаратурны вобраз унутранага драматызму экспазіцыйнай тэмы, які ўзнікае ў выніку адносін наведвальніка да з'яў і людзей, пра якія распавядаюць экспазіцыйныя матэрыялы. Асноўная задача сцэнарыста – перайсці межы, што раздзяляюць навуку і мастацтва.

Асновай экспазіцыі Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка з'яўляецца гістарычны цэнтр старажытнага горада з яго помнікамі архітэктуры, у інтэр'ерах якіх (як вынік музеефікацыі) размешчаны: музейныя экспазіцыі, выставачныя залы, канцэртныя залы камернай і арганнай музыкі, бібліятэка з чытальнай залай, клас для заняткаў па музейнай педагогіцы, студыі для заняткаў народнымі промысламі (ткацтва, пляценне паясоў). Пры знаёмстве з кожным асобным комплексам помнікаў раскрыццё тэмы ажыццяўляецца на трох узроўнях: 1) экспанаванне помніка і тэрыторыі вакол яго, 2) экспанаванне фондавых калекцый у экспазіцыях,

3) выкарыстанне характэрных для дадзенага культурнага аб'екта форм дзеяння (абрады, музыка…).

Як вядома, музеефікацыя прадугледжвае рэстаўрацыю, захаванне і выкарыстанне помнікаў у музейных мэтах, а таксама – высвятленне патэнцыяльна закладзенай у помніках інфармацыі. Музеефікацыю пажадана праводзіць згодна агульна прынятым законам, паэтапна. Першым этапам музеефікацыі можа быць вызначэнне ўсіх элементаў комплекса, якія падлягаюць абавязковаму захаванню. Другім этапам можа быць узнаўленне страчанага, трэцім – арганізацыя працэсу ўспрымання экспазіцыі наведвальнікам. Чацвёрты этап – пабудова візуальна-прасторавых сувязей паміж асобнымі экспазіцыйнымі тэрыторыямі, што асабліва важна і неабходна для стварэння агульнай экспазіцыі такога музейнага аб'яднання, як запаведнік.

## 1.2. Функцыянальная мадэль развіцця запаведніка

Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік – Нацыянальны музей-запаведнік абласнога падпарадкавання (Віцебская вобласць).

Аналізуючы папярэдні вопыт музейнай практыкі ў Полацку і ўнутраныя асаблівасці далейшага развіцця запаведніка, можна прыйсці да высновы, што перспектывы існавання запаведніка павінны быць звязаны з функцыяніраваннем у рамках канцэптуальнай мадэлі, якая не мае аналагаў у даным рэгіёне.

Неабходнасць пошуку прынцыпова новага падыходу да вызначэння асноўных сацыяльных функцый музея-запаведніка і спецыфічных шляхоў іх рэалізацыі звязана з наступнымі фактарамі:

- знаходжанне музейных устаноў на тэрыторыі горада, які сам з'яўляецца ўнікальнай гістарычнай тэрыторыяй;
- наяўнасць вялікага духоўнага патэнцыялу сярод жыхароў сучаснага горада;
- вялікая колькасць нерухомых помнікаў гісторыі і культуры і ўтвораных імі асяродкавых гісторыка-культурных комплексаў;
- унікальнае геаграфічнае палажэнне горада;
- суадносіны параўнальна высокага ўзроўню развіцця ўстаноў адукацыі ў рэгіёне з не вельмі высокім узроўнем развіцця элементаў сацыяльна-культурнай сферы ўстаноў культуры;
- незадавальненне сацыяльнай эфектыўнасцю музеяў, якія працуюць у традыцыйных рамках;
- сувязь двух гарадоў (Полацка і Наваполацка).

У сувязі з вышэйпералічаным прапануецца разглядаць музеі ў сістэме "музей-культура-грамадства" /**8**/. Калі культура - гэта ўсе бакі духоўнага жыцця чалавека, уключаючы духоўнае спажыванне і духоўную вытвор-

часць, то музей можа разглядацца як сацыяльны інстытут, што забяспечвае развіццё культуры ў наступных двух аспектах.

Перш за ўсё, ён выступае ў адносінах да культуры як сховішча духоўнай вытворчасці, культурных каштоўнасцей (ідэалаў, норм, узораў…), якія маюць асаблівыя трохмерныя рэчавыя носьбіты. Паколькі апошнія не вечныя, то, працягваючы іх жыццё, беручы іх пад сваю ахову, музей выконвае важную для культуры ролю папярэджання яе натуральнага збяднення, звязанага з выключэннем з ужытку пэўнай часткі створаных раней каштоўнасцей. Такім чынам, можна фіксаваць у якасці першай важнай спецыфічнай функцыі музея-запаведніка ў сістэме культуры – захавальніцкую. Трэба ўлічваць, што для выканання гэтай функцыі зусім не абавязкова браць помнік з асяроддзя ў музейнае сховішча. Ён можа заставацца на месцы, тым самым павялічваючы свой культурны эфект існавання.

Як вядома, многія гістарычныя гарады сутыкаюцца з праблемамі захавання помнікаў архітэктуры і помнікаў археалогіі /**9**/. Развіццё такіх гарадоў – аб'ектыўны працэс, абумоўлены зменамі ў эканамічным і сацыякультурным укладзе жыцця грамадства. Прырода помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва дваістая: валодаючы гісторыка-культурнай каштоўнасцю яны ў той жа самы час уяўляюць і пэўную матэрыяльную каштоўнасць, з'яўляючыся часткай сучаснага асяроддзя, матэрыяльная, функцыянальная і сацыяльная структура якога заканамерна змяняецца суадносна з развіццём грамадства. Пры гэтым гістарычнае асяроддзе часта ўступае ў канфлікт з тэндэнцыямі развіцця гарадской прасторы, не зарыентаванымі на захаванне яе каштоўных якасцей.

У гэтых умовах узнікаюць непазбежныя супярэчнасці паміж старым і новым – страчанымі функцыянальнымі магчымасцямі і сучаснымі патрабаваннямі, паміж тэндэнцыямі захавання і аднаўлення.

Археалагічныя аб'екты валодаюць відавочнай спецыфікай. Іх размяшчэнне, асаблівасці выяўлення, інтэрпрэтацыі і аховы абумоўлены асобым падыходам да іх. Галоўныя праблемы тут бачацца ў наступным. Перш за ўсё, праблема даследавання помнікаў археалогіі ў тым, што методыка археалагічных даследаванняў непазбежна вядзе да разбурэння, знікнення помніка. У сувязі з гэтым апошнім часам з'явілася тэндэнцыя праводзіць археалагічныя раскопкі помніка толькі тады, калі яму пагражае знікненне пры правядзенні буйных будаўнічых работ ці ў выніку неабарачальных прыродных працэсаў. Далей, сам факт пастаноўкі помніка на ўлік не забяспечвае правядзення ахоўных мерапрыемстваў. Установы аховы помнікаў знаходзяцца ў фінансавай залежнасці ад будаўнічых арганізацый, таму што па закону аб ахове помнікаў даследаванні праводзяцца за кошт замоўцы. Трэ-

цыя праблема заключаецца ў тым, што ў Полацку, як і ў іншых гістарычных гарадах, напрыклад, адсутнічаюць спецыяльныя археалагічныя службы. Ва ўмовах горада часцей за ўсё падлягаюць музеефікацыі толькі рэшткі помнікаў археалогіі. Суадносіны прапаноў па музеефікацыі комплексаў гавораць не на карысць апошніх.

Азначаныя праблемы і павінен вырашаць у Полацку запаведнік, які прапануе абавязковае стварэнне ў гістарычных гарадах філіялаў ці самастойных навуковых установ, звязаных з даследаваннем і рэстаўрацыяй помнікаў архітэктуры, горадабудаўніцтва і археалогіі.

Другая функцыя цесна звязана з культурна-творчай функцыяй запаведніка. Традыцыйнае паняцце адукацыйна-выхаваўчага аспекта пашыраецца да стварэння духоўных прадуктаў, твораў навуковай, мастацкай (экспазіцыйнай) і іншай творчасці. У гэтым працэсе ўдзельнічаюць як музейныя каштоўнасці, так і асабістыя ідэалы тых, хто прыходзіць у музей для працы ці адпачынку. Музейная дзейнасць павінна стаць працай не толькі прафесіяналаў, але і кожнага музейнага наведвальніка. Гэтага магчыма дасягнуць, калі адмовіцца ад загадзя падрыхтаванага пэўнага пераліку паслуг. У новай сітуацыі наведвальнік павінен атрымаць свабоду выбару не толькі шырокага кола заняткаў, але тэм і праблем для асабістых разважанняў, для пошуку адказаў на пытанні, якія яго турбуюць, і свабоду форм выяўлення сваёй творчасці.

Няма іншага такога сацыяльнага інстытута ў нашым грамадстве, які здольны параўнацца з музеем у адказнасці за лёс нашай культурнай спадчыны. Грамадства не знайшло магчымым ускласці гэту місію ні на каго іншага, акрамя музеяў. Таму ў адносінах да культуры музеі абавязаны перш за ўсё – захоўваць. Трэба прызнаць, што галоўнае – гэта захаванне культуры ў комплексе, а не асобных яе частак. І тады становіцца зразумелым наша імкненне да абгрунтавання прыярытэту ***захавальніцкай функцыі*** як найбольш універсальнай і адпавядаючай найбольш агульным грамадскім патрабаванням да музеяў.

Задачамі данай сацыяльнай функцыі могуць быць:

- распаўсюджванне фондавай дзейнасці музеяў ва ўсіх вядомых накірунках (камплектаванне, пастаноўка прадметаў на дзяржаўны ўлік, атрыбуцыя, інвентарызацыя, падтрымка аптымальнага рэжыму існавання музейных прадметаў у фондасховішчы і экспазіцыях, кантроль за ім і інш.), на ўсе катэгорыі помнікаў, у тым ліку і на нерухомыя, а таксама фарміруемыя імі шматкампанентныя асяродкавыя комплексы;

- забеспячэнне такіх умоў рэжыму захаванасці музейных каштоўнасцей, пры якіх усе яны маглі б быць у максімальнай ступені даступнымі ўсім, хто жадае іх выкарыстоўваць у сучаснай грамадскай практыцы, перш за ўсё – у шматграннай культурнай дзейнасці.

Калі ставіць названыя задачы, то трэба адмовіцца ад шматлікіх звыклых уяўленняў, засвоіць новыя метады музейнай работы ў сферы рэалізацыі захавальніцкай функцыі ў культуры. Перш за ўсё размова ідзе пра новы змест паняцця “камплектаванне музейнага збору”. Калі ў традыцыйнай музеялогіі пад гэтым відам дзейнасці мелася на ўвазе звычайнае фарміраванне калекцый, то цяпер, калі ў склад запаведніка ўключаны нерухомыя помнікі і тэрыторыі, усе аб’екты ў межах запаведніка і яго ахоўнай зоны павінны стаць адзінкамі захавання, складовай часткай музейнага збору. Акрамя старажытных помнікаў, у лік музейных прадметаў сёння неабходна ўключыць забудову пачатку і сярэдзіны XX ст., помнікі прамысловай архітэктуры, экалагічныя і ландшафтныя аб’екты. У перспектыве магчыма пашырэнне захавальніцкай работы запаведніка і на ваколіцы Полацка, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей (напрыклад, Захарнічы – сядзіба вядомага акадэміка мастацтва Івана Хруцкага).

Вялікую ролю ў камплектаванні фондаў запаведніка адыгрываюць археалагічныя раскопкі і архітэктурныя даследаванні помнікаў. Знойдзеныя пры гэтым прадметы абавязкова павінны быць пакінуты на месцы, а не пераносіцца ў фондасховішча. Запаведнік даўно выношвае план музеефікацыі комплекса былога Барыса-Глебскага манастыра, дзе магчыма паставіць павільёны над падмуркамі і археалагічнымі рэшткамі асобных храмаў XII ст. і экспанаваць іх разам з рэчамі, якія былі знойдзены пад час археалагічных даследаванняў, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам кандыдата гістарычных навук А.А. Трусава ў 1990 г. Зразумела, што ў такіх выпадках захавальніцкая функцыя набывае тэхналагічны характар, таму што максімальнае раскрыццё аб’ектаў, якія ахоўваюцца, зусім не простая справа.

Найбольшую цікавасць павінны выклікаць тыя аб’екты, эксплуатацыя якіх у сучасных умовах найбольш набліжана да іх першапачатковых функцый. Гэта патрабаванне стаіць асобна ў ліку тых, якія ставіць музейная функцыя дакументавання. Помнік, які сваім існаваннем сцвярджае сваю аўтэнтычнасць і інфарматыўнасць, як дакумент пэўнай эпохі, не патрабуе дадатковага тлумачэння.

Раскрыццё аксіялагічнай, а не толькі навукова-пазнавальнай сутнасці аб’ектаў, прынятых пад ахову, з’яўляецца важнейшай часткай іх музейнай атрыбутыкі, асабліва калі размова ідзе аб прынятай намі канцэптуальнай мадэлі развіцця запаведніка. Вывучэнне культурна-каштоўнаснага патэнцыялу помніка, выяўленне яго актуальнай і важнай для сучасніка сутнасці ёсць неабходны бок падрыхтоўкі рэкамендацый па вызначэнню аптымальных форм сучаснага выкарыстання музейнага збору. Тут неабходна падкрэсліць, што юрыдычны статус запаведніка павінен прадугледжваць яго права самому вызначаць кола карыстальнікаў запаведнымі

аб'ектамі, права прапаноўваць ім свае ўмовы адносна маштабаў, утрымання, тэхналогій дзейнасці. Як правіла, помнікі валодаюць для патэнцыяльных карыстальнікаў асаблівай прывабнасцю ў сувязі з высокай прэстыжнасцю і наведвальнасцю месца, павышаным попытам на ўсе віды паслуг і г.д.

У выніку трэба адзначыць, што назва – гісторыка-культурны музей-запаведнік – адпавядае складу найбольш значных і захоўваемых на ўнікальнай гістарычнай тэрыторыі помнікаў.

Паколькі запаведнік займае асобнае месца ў сферы духоўнай вытворчасці як фактар разнастайнай духоўна-стваральнай, творчай дзейнасці, то няма неабходнасці акрэсліваць межы і складанасць структуры магчымых напрамкаў музейнай работы ў рэалізацыі ***культурна-творчай функцыі*** музея.

Такіх напрамкаў можа быць шмат, ці роўна столькі, колькі можа музей-запаведнік засвоіць сёння, зыходзячы з свайго матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага патэнцыялу і, абавязкова, зыходзячы з культурнага патэнцыялу захоўваемых ім помнікаў. Апошняе мае асаблівае значэнне, таму што сацыяльная эфектыўнасць запаведніка як спецыфічнага культурнага цэнтра залежыць менавіта ад таго, наколькі актыўна ўключаны ў арганізаваную музеем-запаведнікам дзейнасць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, высокія ўзоры мастацтва і маральныя нормы, выпрацаваныя папярэднімі пакаленнямі людзей.

З нагоды новай канцэптуальнай мадэлі ў рабоце музея-запаведніка будуць з'яўляцца новыя падыходы ў вырашэнні тых задач, якія заўсёды лічыліся асноўнымі.

Такім чынам, ***навуковая сфера*** павінна быць дамініруючай у рабоце запаведніка. Яе задачамі на сённяшнім этапе могуць быць наступныя.

- Арганізацыя садзейнічання тым навуковым установам ці асобным спецыялістам, колы інтарэсаў якіх перакрыжоўваюцца з характарам першакрыніц, што ў якасці музейных прадметаў захоўваюцца ў фондах і экспазіцыях запаведніка. Сродкі вырашэння гэтай задачы могуць быць рознымі, уключаючы як адкрытае захоўванне фондаў з магчымасцю працаваць вучоным, так і выданне навуковых каталогаў калекцый з выкарыстаннем сучасных высокааператыўных інфармацыйна-пошукавых сістэм для работы з вялікай колькасцю помнікаў.
- Навукова-даследчыя працы навукоўцаў могуць быць цікавымі і карыснымі запаведніку, але ён мае магчымасць сам ставіць навуковыя праблемы і запрашаць для іх вырашэння навукоўцаў, выступаючы ў якасці замоўцы.
- Запаведнік можа замовіць распрацоўкі новых тэхналогій захавання, метадаў экспанавання, археалагічных раскопак, сацыялагічных даследаванняў і г.д.

- Садзейнічанне запаведніку спецыялістаў з другіх установаў – гэта не сведчанне слабасці сваіх магчымасцей, а праяўленне знешняй функцыі запаведніка па больш шырокаму ўключэнню ахоўваемых ім помнікаў у структуру навуковых ведаў. Найбольш эфектыўным спосабам такога ўключэння з'яўляецца правядзенне на базе запаведніка традыцыйных навукова-практычных канферэнцый і семінараў, мастацкіх пленэраў і выставак.
- У сферы развіцця навукі на першым плане – навукова-арганізацыйная роля запаведніка, а не роля самастойнай навуковай установы.

Што тычыцца навукова-даследчай работы супрацоўнікаў запаведніка, то яна рэгламентуецца прынятым яшчэ ў 1995 г. Палажэннем аб навукова-даследчай рабоце Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Відавочна, што ў наш час важнай праблемай з'яўляецца выхаванне грамадзяніна, фарміраванне яго гістарычнай свядомасці і агульнай культуры. Цяжка пераацаніць ролю музеяў у ***адукацыйна-выхаваўчай сферы***.

Фарміраванне гістарычнай свядомасці звязана са станаўленнем асобы, зацвярджэннем гуманістычнага мыслення; яно належыць да важнейшых працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве.

Школьныя курсы гісторыі маюць для гэтага значныя магчымасці. Гісторыя чалавецтва ўяўляецца вучням у дынаміцы і складанай разнастайнасці. Аднак гістарычная самасвядомасць асобы мае на ўвазе не толькі развіццё інтэлектуальнай сферы, але і засваенне маральных каштоўнасцей. Аналіз практыкі масавага выкладання сведчыць аб прыярытэце педагагічнай увагі да засваення ведаў і недастатковай рабоце па развіццю эмацыянальнай сферы асобы вучня. Для асобаснага разумення гісторыі неабходны зварот да твораў мастацтва, помнікаў культуры, якія захавалі з'явы ў вобразах. На ўроках гісторыі пераважае інфармацыйны характар вывучэння гісторыка-культурных тэм, творы рэдка ўжываюцца для характэрыстыкі эпохі, помнікі культуры часцей за ўсё выконваюць ілюстратыўную ролю.

У гэтай сітуацыі немагчыма абысці ролю музея і музейнай педагогікі ў далучэнні школьнікаў да агульначалавечых каштоўнасцей і фарміравання гістарычнай свядомасці. Гэты складаны працэс павінен ажыццяўляцца ў выніку сумеснай дзейнасці настаўніка і музейнага педагога.

Работа са школьнікамі і дашкольнікамі – найбольш традыцыйны напрамак музейнай дзейнасці ў адукацыйна-выхаваўчай рабоце запаведніка.

З дашкольнікамі запаведнік пачаў працаваць у 1992 г. Асноўнай формай работы была перасоўная выстава. Зараз колькасць розных форм работы значна павялічылася (выставы аднаго дня, работа на экспазіцыях, заняткі

ў класе музейнай педагогікі, экскурсіі, дэманстрацыя фільмаў і слайдаў і г.д.). Тэматыка заняткаў у асноўным тычыцца этнаграфіі, выяўленчага мастацтва і прыроды. У перспектыве тэматыка будзе пашырана за кошт новых музейных экспазіцый і новых праграм для дзяцей чатырохгадовага ўзросту (“Вучымся глядзець і бачыць, слухаць і чуць”). На гэтым этапе работы галоўным з’яўляецца падрыхтоўка дашкольнікаў да ўспрымання музейнага прадмета.

У 1992 г. пачалася работа і з малодшымі школьнікамі. Галоўнай мэтай гэтага этапа з’яўляецца выхаванне патэнцыяльнага наведвальніка музея, ў сувязі з чым ставіцца задача падрыхтаваць школьніка да ўспрымання музейнай экспазіцыі. Формы работы – самыя розныя: экскурсіі, заняткі-гульні, заняткі-даследаванні, тэатралізаваныя прадстаўленні і г.д.). У перспектыве прадугледжваецца пашырэнне тэматыкі, правядзенне псіхалагічнага і сацыялагічнага аналізаў заняткаў. На гэтым этапе ўжо пачынаецца выхаванне гістарычнай самасвядомасці шляхам развіцця эмацыянальнай сферы падчас знаёмства з мясцовым гістарычным матэрыялам праз помнікі гісторыі і культуры.

Для школьнікаў сярэдняга і старэйшага ўзросту падрыхтаваны праграмы рознай тэматыкі, якія прадугледжваюць знаёмства з гісторыяй Полаччыны на прыкладзе нашых помнікаў, але ў кантэксце агульнаеўрапейскай культуры. Формамі работы з’яўляюцца: экскурсіі, лекторыі, лекцыі-канцэрты, урокі гісторыі і беларускай літаратуры, факультатыўныя заняткі па краязнаўству, гурткі і клубы. У перспектыве, пры стварэнні дзіцячага музея, для гэтай групы школьнікаў трэба адкрыць спецыяльны клас з неабходным тэхнічным абсталяваннем (камп’ютэры, відэаапаратура, праектары і г.д.), мультымедыйнымі праграмамі па гісторыі і культуры.

Для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў прадугледжаны комплексныя лекторыі на ўвесь навучальны год, якія, акрамя экскурсій і лекцый, прадугледжваюць яшчэ і канцэрты камернай і арганнай музыкі. На базе запаведніка праходзіць музейная практыка для студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ. У перспектыве тэматыку такіх абанементаў трэба пашырыць і арганізаваць сістэму бесперапыннай падрыхтоўкі ці адукацыі музеёлагаў, рэстаўратараў… на базе запаведніка ў форме стажыровак, майстар-класаў і вучэбна-вытворчай практыкі.

Вялікую ўвагу запаведнік надае рабоце з наведвальнікамі іншых узроставых груп. У перспектыве рыхтуюцца спецыяльныя праграмы для сямейнага наведвання музеяў, праграмы для людзей сталага ўзросту і інвалідаў па зроку і слыху.

Для вырашэння задач запаведніка ў адукацыйна-выхаваўчай сферы патрэбны:

- прафесійна падрыхтаваныя супрацоўнікі,
- арганізацыя спецыяльных экспазіцыйных пляцовак,
- арганізацыя інфраструктуры для працэса бесперапыннай падрыхтоўкі музейных кадраў,
- сумесная праца музейных педагогаў і зацікаўленых настаўнікаў школ горада,
- дапамога школьным музеям,
- фарміраванне рабочай групы настаўнікаў, згодных працаваць з малодшымі школьнікамі па музейна-педагагічных праграмах запаведніка.

У сувязі с прыняццем “Комплекснай доўгатэрміновай праграмы развіцця г. Полацка і Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка на 2000-2005 гады” запаведнік павінен звярнуць асаблівую ўвагу на якасць абслугоўвання турыстаў, якія наведваюць Полацк.

Патэнцыял кадраў для правядзення экскурсій у музеях і па гораду ў запаведніку дастатковы, але нельга забывацца на якасць абслугоўвання, якая часта звязана з адсутнасцю элементарных умоў для адпачынку падчас наведвання горада (туалеты, кіёскі з прахладжальнымі напоямі і г.д.).

Запаведнік гатовы прымаць удзел у стварэнні інфраструктуры турызму на тэрыторыі горада.

Што тычыцца непасрэднага прыёму турыстаў музеямі запаведніка, з гэтай нагоды неабходна:

- стварыць пры запаведніку пастаянныя курсы па падрыхтоўцы экскурсаводаў для правядзення экскурсій па гораду з ліку асоб, якія не працуюць у запаведніку;
- стварыць факультатыў па падрыхтоўцы экскурсаводаў на базе Нацыянальнай гімназіі;
- правесці мерапрыемствы па паляпшэнню рэкрэацыйных умоў для турыстаў і мясцовых наведвальнікаў музеяў запаведніка;
- праводзіць агульнагарадскія святы на базе запаведніка;
- наладзіць больш цесныя сувязі з прадстаўнікамі царквы ў пытаннях абслугоўвання турыстаў на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

**Вывады:**

**1.** Канцэптуальнай мэтай Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка з’яўляецца музеефікацыя гістарычных раёнаў горада і яго цэнтра. У выніку музеефікацыі да дзевяці ўжо існуючых музеяў у хуткім часе будуць далучаны яшчэ тры, якія дапоўняць агульную экспазіцыю. Наперадзе стварэнне яшчэ шэрагу музеяў і рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры, якія разам з тымі тэрыторыямі, што прылягаюць, будуць прыстасаваны пад музейныя экспазіцыі.

**2.** На падставе назапашанага практычнага вопыту ідзе інтэнсіўны працэс распрацоўкі і тэарэтычнага абгрунтавання асноўных прынцыпаў музеефікацыі полацкіх помнікаў. Сярод іх вылучаецца патрабаванне адначасовага стварэння рэстаўрацыйнага праекта і праекта музейнага выкарыстання. Распрацоўваюцца методыкі пашырэння ахоўных зон запаведніка, вызначэння аптымальных рэжымаў эксплуатацыі помнікаў, прасторавай арганізацыі экспазіцый, форм экспазіцыйнага абсталявання для музеяў-помнікаў. Пры выкарыстанні помнікаў архітэктуры пад музейныя экспазіцыі прасочваецца імкненне звесці да мінімуму дысананс паміж архітэктурна-прасторавым асяроддзем і прыўнесенымі элементамі экспазіцыі (экспанатамі, абсталяваннем). Пры музеефікацыі ў якасці самастойнага аб’екта паказу вялікае значэнне надаецца навуковай рэканструкцыі цэласнага ансамбля архітэктуры, жывапісу, прадметаў мэблі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а ў выпадках значных страт у інтэр’ерах – раскрыццю мастацкага значэння помніка пры дапамозе музейных сродкаў – музыкі, асвятлення, тэхнікі.

**3.** Мэце стварэння горада-музея спрыяе на сённяшнім этапе дзяржаўная Комплексная доўгатэрміновая праграма развіцця г. Полацка і Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка на 2000-2005 гг. Упершыню ў адзіны дакумент уключаны праблемы рэстаўрацыі, музеефікацыі, развіцця турызму і гарадской турысцкай інфраструктуры, рэкламы і інш., неабходныя для рэалізацыі задач ператварэння Полацка ў турыстычны і музейны цэнтр.

**4.** Запаведнік у сувязі з гэтым імкнецца весці актыўную работу па стварэнню неабходнай музейнай мадэлі ў сістэме “музей – культура – грамадства”, якая, абапіраючыся на музейныя традыцыі, улічвала б і новыя дасягненні сучаснай музеялогіі.

**5.** Такім чынам, функцыянальную мадэль перспектыўнага развіцця запаведніка можна ахарактарызаваць так: захаванне культуры ў комплексе праз музеефікацыю ўнікальнай гістарычнай тэрыторыі горада з удзелам не толькі прафесійных музеёлагаў і патэнцыяльных наведвальнікаў музеяў, але і ўсіх сацыяльна-узроставых груп грамадства. Асноўнымі задачамі па рэалізацыі такой мадэлі з’яўляюцца: праца ў захавальніцкай, культурна-творчай, адукацыйна-выхаваўчай сферы, арганізацыя навуковых даследаванняў, развіццё турызму.

## Літаратура

1. **Гліннік В.В.** Праблемы захавання культурнай спадчыны Нясвіжа// Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. Вып. 5, Мн., 1998. – с. 39-40.

2. **Гліннік В.В.** Мажлівасьці музеефікацыі гістарычнага цэнтра Полацка на прынцыпах "унікальнае гістарычнае тэрыторыі".// Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. Полацк: ППП "Спадчына Ф.Скарыны", 1996.– с. 6-9.

3. **Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны"**// Звязда. 1992, 1 снежня. – с. 3-5.

4. **Закон Рэспублікі Беларусь "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь"**. Мн., 5 верасня 1996.

5. **Закон Республики Беларусь "О туризме"**// Турысцкі веснік. 2000. № 5. – с. 4-12.

6. **Калбаска А.** Музеефікацыя унікальных гістарычных тэрыторый. Праблемы юрыдычнага забеспячэння.// Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. Полацк: ППП "Спадчына Ф.Скарыны", 1996. – с.14-18.

7. **Каменецкий И.С., Каулен М.Г.** Музеефикация памятников// Российская музейная энциклопедия: В 2 т. – М.: Прогресс, "Рипок Классик", 2001. – 416 с., ил., Т.1. А-М., с. 390-393.

8. **Лямин И.В.** Монрепо: взгляд в 21 век// Санкт-Петербург. Специальный выпуск. 1994. № 10. – с. 18-20.

9. **Никишин Н.А., Алексеев И.В.** Научная концепция Ивангородского историко-архитектурного и художественного музея-запаведника. М., 1990. – 67 с.

10. **Церашчатава В.В.** Старажытна – беларускі манументальны жывапіс XI-XVIII стст. Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 183 с., іл.

# “Тыгоднік ілюстраваны” у фондах НПГКМЗ

***Г.П. Зуева***

У фондах НПГКМЗ захоўваецца шмат перыядычных выданняў розных часоў, якія з’яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для характарыстыкі пэўных гістарычных эпох. Сярод перыядычных выданняў асобна можна выдзеліць польскамоўныя часопісы другой паловы XIX – пачатку XX стст.: “Тыгоднік ілюстраваны”, “Вэндровец”, “Земя” і інш. Аб’ектам майго вывучэння з’яўляецца калекцыя часопісаў “Тыгоднік ілюстраваны” (“Tygodnik ilustrowany”).

“Тыгоднік ілюстраваны” – польскі ілюстраваны часопіс-штотыднёвік, які выдаваўся ў Варшаве з 1859 г. да 1939 г. У фондах запаведніка захоўваюцца падшыўкі гэтага часопіса за 1873, 1877, 1878, 1880, 1881, 1882, 1883, 1884, 1886, 1898, 1899 гады. Усяго 19 падшывак, у сярэднім па 26 нумароў у кожнай. Усе гэтыя падшыўкі часопіса былі перададзены ў фонды НПГКМЗ у 1991 годзе з бібліятэкі Саюза мастакоў БССР, г. Мінск.

Паколькі звестак пра выдаўцоў, рэдактараў і друкароў часопіса “Тыгоднік ілюстраваны” у энцыклапедычнай літаратуры, вывучанай намі, утрымліваецца вельмі мала, то ніжэй прыведзеныя дадзеныя грунтуюцца на аснове аналізу выхадных дадзеных і тых матэрыялаў, якія змешчаны непасрэдна ў разглядаемых намі паасобніках. З 1859 г. да 1882г. выдаўцом і друкаром “Тыгодніка ілюстраванага” быў “даволі энергічны і прадпрымальны чалавек у выдавецкай справе Польшчы”/**1**/ Юзаф Унгэр (Jozaf Unger). Ён валодаў друкарняй у Варшаве, шэрагам кнігарняў у Польшчы. Была ў яго кнігарня і ў Санкт-Пецярбургу. Акрамя “Тыгодніка ілюстраванага” Юзаф Унгэр друкаваў календары, энцыклапедычную літаратуру, справаздачы, мастацкія творы. Рэдактарам часопіса ў гэты час быў Людвік Енікэ (Ludwik Jenike). Нарадзіўся ён у 1818 г. у Варшаве. З ранняга юнацтва яго цягнула да публіцыстычнай дзейнасці. Першы яго артыкул быў надрукаваны ў 1838 г. у газеце “Gazeta poranna”, а затым ён пачаў друкаваць свае артыкулы на літаратуразнаўчую і мовазнаўчую тэматыку і ў іншых выданнях. Як рэдактар упершыню ён выступіў у 1852 г. у штомесячным часопісе “Ksikgi swiata”. Калі Юзаф Унгэр прапанаваў Людвіку Енікэ стаць рэдактарам “Тыгодніка ілюстраванага”, той даў згоду і часопіс стаў справай яго жыцця. “Не было ніводнай падзеі ў краі польскім і за мяжой, якая б не знайшла свайго водгуку на старонках “Тыгодніка …”, і не было ў літаратуры польскай ніводнага значнага твора, які б не з’явіўся ў часопісе. Меў Енікэ як рэдактар дар аб’ядноўваць вакол сябе людзей, і як ніхто іншы ён мог заўважыць і выправіць у свет маладыя таленты. Дастаткова ўспомніць, што менавіта ў гэтым часопісе з’явіліся самыя першыя творы Элізы Ажэшкі,

Марыі Канапніцкай, Генрыка Сенкевіча і інш./**2**/ На працягу дзесяцігоддзяў Людвік Енікэ заставаўся рэдактарам "Тыгодніка ілюстраванага". Апошняя падшыўка ў калекцыі, дзе яго імя як рэдактара пазначана ў выхадных дадзеных, датуецца 1886 г. У часопісах за 1898-1899 гг. рэдактарам значыцца доктар Юзаф Вольф (Jozef Wolff).

Першым выдаўцом часопіса быў Юзаф Унгэр. У 1882 г. яго змяніў Грацыян Унгэр. З 1883 г. часопіс стаў уласнасцю выдавецкай суполкі, якую стварылі кнігавыдавецкая фірма "Gebethner i Wolff", Людвік Енікэ і прафесар Адольф Павінскі. Выдаўцамі сталі Густаў Гэбетнэр і Роберт Вольф, даволі вядомыя ў выдавецкай сферы людзі. Яшчэ ў 1857 г. узнікла буйнейшая ў гісторыі польскай кніжнай справы фірма "Gebethner i Wolff", якая да канца 30-х гадоў XX ст. выпусціла каля 7 тысяч назваў кніг. На працягу другой паловы 1880-х – 1890-х гадоў мяняюцца таксама і друкары. У выхадных дадзеных часопіса за 1886 г. ужо значыцца "Друк Сыноў Оргельбранда". С. Оргельбранд у сярэдзіне XIX ст. заснаваў у Варшаве буйнейшую друкарскую фірму. Пасля яго смерці ў 1868 г. справу працягвалі яго сыны. У 1898 г. друкаром часопіса быў Эміль Скіўскі (Emil Skiwski), а з № 37 1899 г. пазначана "Друк Варшаўскага акцыянернага мастацка-выдавецкага таварыства". Змена друкароў паўплывала на знешні выгляд часопіса, на яго мастацка-тэхнічнае афармленне. А вось па зместу часопіс заставаўся кансерватыўным. На тытуле ў лаканічнай форме перадаюцца звесткі пра змест часопіса. На ім пазначана: "Тыгоднік ілюстраваны" – часопіс, які змяшчае важнейшыя падзеі грамадскага жыцця, біяграфіі знакамітых людзей, апісанні нацыянальных помнікаў і каштоўнасцей, падарожжы, уключае аповесці, апавяданні, вершы, справаздачы з мастацкіх выстаў, музычныя, тэатральныя, літаратурныя прагляды, артыкулы з галіны прыродазнаўчых навук, прамысловасці, вынаходніцтваў, археалогіі, звесткі аб народных тыпах, строях, бытавыя і гумарыстычныя замалёўкі і г.д. Можна адзначыць некаторыя рубрыкі, якія сустракаюцца ў кожным часопісе: "Замежная хроніка па Крашэўскаму", "Прагляд палітычны", "Хроніка тыдня", "Біяграфіі" і інш. Часопіс змяшчаў творы знакамітых польскіх пісьменнікаў, паэтаў ( часта гэта былі першыя публікацыі, такія як: аповесць Элізы Ажэшкі "Арганаўты", гістарычны раман Г. Сенкевіча "Крыжакі" і інш.).

Цікавасць часопіса яшчэ і ў тым, што ў ім можна знайсці краязнаўчыя, фальклорна-этнаграфічныя, гістарычныя матэрыялы, прысвечаныя Беларусі. Напрыклад, матэрыялы пра Наваградак, Нясвіж, Гродна, Мінск і іншыя беларускія гарады і мястэчкі. У падшыўцы за 1878 год змешчаны артыкул З. Глогэра "Каложа у Гародне", у падшыўках за 1873, 1877 гг. – "Лісты з падарожжа па краю" Феліцыяна Сурына, дзе апісваецца пры-

рода, насельніцтва, гаспадарка беларускіх земляў. Польскія даследчыкі ў пераважнай большасці з пільнай увагай і добразычлівасцю адносіліся да публікацый беларускага фальклору, апісанняў беларускіх гістарычных мясцін, таму матэрыялы, змешчаныя ў "Тыгодніку ілюстраваным", маюць інфармацыйнае значэнне для тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі XIX – пачатку XX стст.

Паколькі інфармацыйная каштоўнасць часопіса "Тыгоднік ілюстраваны" відавочная, гэта абумоўлівае магчымасць яго выкарыстання як пры даследчай працы, так і ў музейнай дзейнасці, а таксама выклікае неабходнасць стварэння каталога тых паасобнікаў, што захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ.

**Крыніцы**

1. **Тыгоднік ілюстраваны**. 1882 г., № 354. с. 226.
2. **Тыгоднік ілюстраваны**. 1886 г., № 208. с. 410-411.

**Літаратура**

1. **Александровіч С.Х.** Пуцявіны роднага слова. Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX стст. Мн., 1971. – с. 43-46.
2. **Літвіновіч А., Янушкевіч І.** Тыгоднік ілюстраваны.// Энцыклапедыя ЛІМ. Т.5. Мн., 1987. – с. 294.
3. **Літвіновіч А., Янушкевіч І.** Тыгоднік ілюстраваны.// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6-ці тамах. Т.6, кн.1. Мн., 2001. – с. 547.
4. **Польша. Начало книгопечатания. Издательское дело.** // Книговедение. Энциклопедический словарь. М., 1982. – с. 418-419.

# Новыя звесткі пра гарбарны завод П. Ільмера

***В.Д. Краско***

Вывучая тэму музейны супрацоўнік заўсёды мае на ўвазе стварэнне экспазіцыі – раскрыццё тэмы праз музейныя прадметы. І тут пастаянна ўзнікае пытанне “Чаму? І пакуль есць надзея знайсці адказ, супрацоўнік не мае права супакоіцца. І гэта пытанне ўзнікае як у дачыненні да новых рэчаў, так і да старых у новым кантэксце. Аб’ектам майго даследавання з’явіўся гарбарны завод Ільмера, пра які ужо гаварылі неаднойчы. Паспрабуем аднавіць хроніку падзей, звязанных з гэтым заводом. У 1996 г. падчас разборкі дома па вул.Ф. Скарыны, 7 былі выпадкова знойдзены дакументы гарбарнага завода Пінхуса Ільмера, датаваныя 1910-1916 гг. Гэтыя дакументы, нягледзячы на тое, што ўтрымліваюць звесткі аб прадукцыі завода, сыравіне, месцы закупкі матэрыялаў, пастаўшчыках, не даюць нам дастаткова поўнага ўяўлення ні пра завод, ні пра самаго ўладальніка. Тым больш, што прозвішча Ільмера было абсалютна незнаёмым. Адразу ўзнікаў шэраг пытанняў. Завод Д. Шутко быў добра знаемы і па спісках, якія былі складзены ў статыстычных дакументах, і па рапартах паліцмайстра. Апошнія звесткі пра завод Шутко сустракаюцца ў 1909 г. Але прозвшча Ільмера не сустракаецца ні ў адным са спіскаў. Што гэта? Прабелы фабрычна – заводскай статыстыкі? Зыходзячы са знойдзеных дакументаў, завод Ільмера быў і мы маем пэўныя звесткі аб наяўнасці завода. Безумоўна, тут неабходна ўлічыць тое, што некаторыя заводы выпадалі з-пад увагі фабрычнай статыстыкі. Асабліва гэта датычылася тых заводаў, якія не адыгрывалі значнай ролі ў жыцці горада. Ільмер, які купіў альбо арэндаваў вытворчасць Шутко, як можна меркаваць, ніколі да гэтага не займаўся гарбарствам, і не належыў да ліку наватараў. Па знойдзеных дакументах была зроблена спроба аднавіць гісторыю завода и жыццяпіс самаго Ільмера. На жаль, гэтых звестак было мала, таму некаторыя высновы, зробленыя намі, насілі гіпатэтычны характар. Напрыклад, на падставе дакумента, у прыватнасці паштоўкі, якая была адпраўлена Ільмеру з Масквы 16 кастрычніка 1915г. была зроблена выснова аб тым, што Ільмер прадаў завод у сувязі з пачаткам ваенных дзеянняў. Але у кастрычніку 2002 г. у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь мне удалося выявіць справу на 23 лістах “О закрытии в Полоцке кожевенного завода Пинхуса Ільмера за антисанитарное содержание и об аресте владельца завода”. Датуецца справа – 3верасня 1915 – снежань 1915 г. Першы дакумент – Акт Полацкай ваенна-санітарнай камісіі ад 10 чэрвеня 1915 г., у якім адзначаецца наступнае: “Кожевенный завод находится в черте города Полоцка на Плиговской улице и принадлежит Пинхусу Ильмеру, содержится в крайне антисанитарном состоянии: полы

гнилые, всюду грязь, отсутствует вентиляция, сток для жидких отбросов направляется под откос р. Полоты, что может служить источником заразы". Камісія пастанавіла неадкладна выправіць хібы ў 2-тыднёвы тэрмін[1]. 1 ліпеня 1915 г. была праведзена паўторная праверка, якая канстатавала: "Ильмер почти ничего не сделал, а именно насыпь из обработанных нечистот не вывезена, а свалена ближе к реке. При детальном осмотре обнаружена недалеко от свалки деревянная труба, которая была тщательно замаскирована мусором и по разборке ее оказалось, что вонючая жидкость с завода прямо направляется в Полоту. Склад невыделанной кожи находится не в отдельном помещении, а кожи лежат вместе с дубильными корками. В помещении завода, хоть и начаты бетонные полы, но слой бетона тонкий. Электрические вентиляторы не действуют, воздух ужасный. В помещении до такой степени грязно и темно, что работать невозможно. На весь завод существует только одна цементная выгребная яма (по-видимому, для отвода глаз), приблизительно на одну небольшую бочку, что при работе завода и должной обильной поливке не может хватить и на однократную промывку пола в день, а все жидкие отбросы стекают в трубу в реку Полата."[2] Камісія выказвае просьбу да  паліцмайстра неадкладна зачыніць завод. Чарговае абследаванне было праведзена 15 ліпеня. І зноў чытаем наступныя радкі: "Завод оказался в таком же состоянии, владелец упорно не желает ничего делать, работы же по выделке кож производятся. При таких условиях в черте города не может существовать, так как в Полоцке отсутствует водопровод и канализация"[3]. Апошняе абследаванне было праведзена 23 ліпеня 1915 г., а 2 жніўня начальнік акруговага ваенна-санітарнага Упраўлення загадвае арыштаваць Ільмера за антысанітарны стан завода. Невядома па якой прычыне Ільмера не арыштавалі адразу. З дакументаў мы бачым, што ў жніўні быў складзены яшчэ адзін акт полацкай ваенна-санітарнай камісіі, а 18 жнўня полацкі паліцмайстар атрымлівае прадпісанне за № 21592 , згодна з якім 22 жніўня 1915г. у 10 гадзін раніцы Ільмера арыштавалі і пераправадзілі ў Полацкую турму, дзе ён павінен быў правесці адзін месяц. І ўсё ж ў Ільмера знайшліся  заступнікі ў асобе жонкі Хаі Ільмер, якая, праўда, не адразу, а толькі 1 верасня піша прашэнне віцебскаму губернатару з просьбай аб вызваленні мужа ў сувязі з тым, што на заводзе засталіся "кожи, подлежащие эвакуацыі. Остальная часть наказания будет отбыта после эвакуации кож"[4]. Яна таксама дасылае тэлеграму на імя Галоўнага начальніка Двінскай ваеннай округі з просьбай аб вызваленні мужа.

[1] НГАРБ, ф. 1430, в. 1, с. 49160, л. 12

[2] Там жа.

[3] Там жа, л. 13

[4] Там жа, л. 14

Віцебскі губернатар задавальняе просьбу жанчыны, але вядома, што Ільмер прабыў у турме да 22 верасня. Пасля яго вызвалення завод ужо не працуе. Захавалася прашэнне самаго Ільмера Віцебскаму губернатару. Гэта прашэнне дазваляе выказаць некаторыя меркаванні. Ільмер піша: “6 октября пристав закрыл и опечатал завод, арендуемый мной от наследников Шутко, хотя в помещении находятся выработанные кожи и инвентарь, сама же выработка кож прекратилась 2 месяца назад, а остались лишь кожи, подлежащие высушке, они могут подвергнуться порче и я потерплю убытки. Под словом закрыть – прекратить производство, а не убрать инвентарь и превратить завод в помещение для других нужд, ибо здание состоит в моем арендном пользовании по 1 января 1921г. и арендные деньги уплачены по январь 1916.”[5] Уладальнік завода выказвае просьбу аб выкарыстанні памяшкання пад іншыя патрэбы. І менавіта ў гэты час і з’яўляецца паштоўка, у якой размова ідзе не аб продажы завода, а пад словам “производство” трэба разумець “скуры і інвентар”.

У гэтай справе шмат незразумелага. Напрыклад, якім чынам Ільмер мог наладзіць працу электрычных вентылятараў, калі амаль не працавала электрастанцыя? Па-другое, чаму менавіта ў ваенны час, калі панавала гаспадарчая разруха, такая ўвага была нададзена санітарнаму стану завода і горада? Вадаправод і каналізацыя ў Полацку заўсёды адсутнічалі, а “все жидкие отбросы” заўсёды, нават калі завод належыў Шутко, сцякалі праз трубу ў Палату. Здаецца, што матэрыялы, якія зыходзяць з камісіі, патрабуюць надта крытычных адносін да іх, так як яны нікім не правяраліся і ад членаў камісіі цалкам залежала – ці паведамляць аб сапраўдным становішчы спраў альбо скрыць гэта. Чамусьці звычайна ў афіцыйных архівах асядаюць усялякага роду дакументы, звязаныя з крымінальнымі працэсамі, паклепамі, скаргамі і г.д., а пададзеныя вышэй факты, відаць, можна растлумачыць з дапамогай іншых знойдзеных у архіве дакументаў. Гэтыя дакументы наводзяць на думку аб тым, што закрыццё завода – справа не выпадковая. Аналагічныя праблемы вымушаны былі вырашаць і ўладальнікі іншых заводаў. Тады ж у жніўні 1915 г. быў зачынены завод мінеральных вод Юдзіна. Нягледзячы на тое, што ўладальнік адразу выправіў усе хібы, указаныя камісіяй, завод не быў адкрыты ў сувязі з тым, што “заведение было закрыто по распоряжению главного начальника санитарного управления”[6]. Яшчэ адна архіўная крыніца наводзіць на роздум. Гэта архіўны фонд жандармскага ўпраулення, які зараз рассакрэчаны. І справа гэта на 136 лістах называецца “Агентурные сведения по контрразведке по Витебской губернии”. Дакументы, датаваныя 1916 го-

[5] НГАРБ, ф.1430, в.1, с.49160, л. 18
[6] Там жа, л. 22

дам (са студзеня па снежань) прадстаўляюць несумненную цікавасць для аднаўлення падзей таго часу і адлюстроўваюць увесь драматызм сітуацыі. Гэты цэлы комплес дакладаў, даносаў розных агентаў па мянушках "Полацкі", "Квартальны" і г.д. Нагадаю хроніку ваенных падзей. Летам 1915 года ўся тэрыторыя Беларусі стала арэнай ваенных дзеянняў. У восень 1915 г. фронт стабілізаваўся па лініі Двінск-Паставы-Баранавічы-Пінск. У выніку Беларусь была падзелена на дзве часткі: заходняя апынулася пад нямецкай акупацыяй, а ўсходняя, у тым ліку Полацк, ператварылася ў прыфрантавую паласу. Эканамічнае становішча ўсходняй часткі было цяжкім. З пачаткам вайны і пераводам транспарту на абслугоўванне фронту парушыліся сувязі прамысловасці Беларусі з рынкам збыту і крыніцамі сыравіны, паліва. Быў установлены жорсткі рэжым ваенна-паліцэйскага тэрору. Прыфрантавая паласа была перанасычана войскамі, органамі палітычнай бяспекі і ваеннай контрразведкі і стала сапраўды "залатым дном" для рэквізіцый, якія праводзіліся ў шырокіх памерах. Для правядзення рэквізіцый ствараліся спецыяльныя камісіі як цывільныя, так і ваенныя. Дык вось у справе знаходзіцца сакрэтны дакумент "Об уничтожении кожевенного завода наследников Шутко, обращенного в баню Всеросийского Земского Союза и паровой мельницы за р. Полотой в прачечную того же Союза". Гэты дакумент дае магчымасць даведацца аб тым, што стала з заводам Ільмера пасля кастрычніка 1916 г. Як ўжо адзначана раней, Ільмер не атрымаў дазвол выкарыстоўваць памяшканне для іншых патрэб. І першы дакумент – гэта загад Віцебскага губернатара ад 9 верасня 1915 г., за № 23569 "закрыть на время военных действий с тем, чтобы здание, занимаемое заводом Ільмера, было бы по надлежащим оздоровлении использовано для надобностей полоцкого гарнизона"[7]. У сувязі з гэтым Ільмер з 1 студзеня 1916 г. не стаў плаціць грошы за арэнду. Па сутнасці ён разрывае кантракт, згодна з якім ён павінен быў плаціць да 1921 г. Уладальніца дома распачынае судовы працэс супраць Ільмера за парушэнне кантракта. Судовы працэс зацягнуўся, зразумела па якой прычыне. У сувязі з тым, што гарбарны завод не працаваў, будынак быў рэквізаваны для ваеннай лазні. Завод быў перададзены начальніку будаўнічага атрада. Ільмеру вярнулі частку абсталявання, а другую частку ў яго купілі. Можна зрабіцыь вывад, што менавіта тады і былі схаваны дакументы, якія знайшлі ў 1996 г. Такі сумны канец завода Ільмера. Але не толька яго. Можна пералічыць паравы млын Левіна, завод мінеральных вод Юдзіна і шмат іншых заводаў. Адна толькі тытунёвая фабрыка, неягледзячы на ўсе складанасці ваеннага часу, бясконцыя рэвізіі працавала на адпаведным ўзроўні.

[7] НГАРБ, ф. 2499, в. 3, с. 12, л. 75

# Архитектурная пластика фасадов зданий, выстроенных в г. Полоцке в к. XIX – н. XX вв.

*Т.А. Орлова*

В городском строительстве в к. XIX – н. XX. вв. всё больше стало появляться зданий и сооружений общественного назначения и жилых каменных домов. К новым типам объектов, выстроенных из современных строительных материалов, относятся разнообразные торговые, банковские, административно-конторские, учебные, культовые здания, транспортные и инженерные сооружения. В то же время перестраивались и некоторые существовавшие ранее дома, что совершенно изменяло их композиционно-художественную систему.

В данный период утрачиваются ансамблевые принципы застройки. Архитекторы выполняют лишь отдельные заказы частных лиц, промышленных и коммерческих организаций, совершенно не заинтересованных в том, чтобы решать задачи градостроительного порядка, обеспечивать архитектурное единство улиц и площадей. В большинстве случаев облик фасадов зданий, так же как и внутренней отделки помещений, выбор тех или иных пригодных для этого стилей определялись заказчиком, его вкусами и материальными возможностями.

Всё чаще с целью украшения фасадов и интерьеров начали прибегать к эклектическому сочетанию разностилевых элементов, отходя от жёстко регламентированных приёмов и форм классицизма. Поскольку эклектизм допускал произвольный выбор в сочетании форм, то в различных комбинациях находили применение элементы многих псевдостилей. Стилизаторство (эклектика) предполагает верность формам определённого стиля в пределах одного элемента – фасада, интерьера. Стилизаторство получило преимущественное распространение в строительстве уникальных зданий – дворцов, музеев, театров, церквей и т.д. Область же, где распространялся эклектизм – это постройки массового назначения: доходные дома, больницы, школы, магазины.

С середины XIX в. элементом, определяющим пропорциональный строй, композицию и облик фасада, становится декор, обрамляющий окна и простенки между окнами. Ордерные формы, если они по традиции ещё употребляются, используются на тех же основаниях, что и детали, заимствованные из других архитектурных стилей. Композиция приобретает откровенно декоративный характер. Стиль (в том числе и ордер) низводится до уровня декоративной детали, мотива, взятого из архитектуры определённой эпохи. В композиции обывательских домов раньше, чем в любом другом типе зданий, возникают предпосылки перерождения архитектурного стиля, имитируется как отдельный элемент системы, так и вся система с характер-

ными для неё связями, формами, хотя истолковывается декоративно. Декоративная отделка фасада, как правило, отражает оптимальное соответствие между объёмно-конструктивной структурой и её выражением на внешней поверхности. Разбивая плоскость стены, подчеркивая вход или ограничивая здание, архитектурная пластика фасадов дает информацию об организации композиции, о внутреннем строении объема, его пространственной схеме.

Основной тип пластики поверхности – структурная пластика – органично связан с архитектурой и является связующим между видами и типами пластики. Структурной пластике присуща геометрическая форма, она тяготеет к ограничивающим симметричным контурам. Размещение структурной пластики часто вызвано целью подчеркнуть опоры, зрительно закрепить углы, ограничить плоскость, выявить этажи. Она тесно связана благодаря этому и с конструктивной основой здания, хотя и не всегда может соответствовать реальной объёмно-конструктивной структуре сооружения.

Большинство домов, выстроенных в рассматриваемый период в г.Полоцке, имеют богатую, разнообразную пластику фасадов с четким ритмическим делением, пропорциями и масштабом. В структуре некоторых зданий, состоящих из однородных, повторяющихся по вертикали и горизонтали ячеек- квартир изначально была заложена однородность, повторность, позволившие проявиться стилеобразующему принципу эклектики наиболее полно и исчерпывающе в композиции их фасадов. В качестве примера можно привести несколько зданий. Дом №8 по ул. Войкова (**рис. 1**) представляет собой двухэтажное здание коридорного типа. Главный фасад разделён пилястрами на четыре неравные плоскости. Нижний ярус оконных проемов декорирован имитирующими аркаду обрамлениями, междуэтажными и подоконными нишами. Второй ярус оконных проемов декорирован наличниками, подоконными тягами. Этажи разделены междуэтажной профилированной тягой. Венчает здание развитый профилированный карниз. Выразительность фасада дома № 5 по пр. К. Маркса (**рис. 2**) также достигается регулярным ритмом прямоугольных окон с использованием в центральной части арочных оконных обрамлений. Здание декорировано пилястрами, лопатками, подоконными нишами. Оконные проёмы главного фасада декорированы наличниками. Этажи разделены междуэтажными тягами. Венчает здание развитый профилированный карниз. Фасады дома № 7 по ул. Энгельса (**рис. 3**) декорированы лопатками, подоконными нишами, лучковыми сандриками над оконными проёмами 2-го этажа. Первый этаж декорирован рустом.

Другой вид архитектурной пластики- орнаментальная, часто включается в структурную, составляя с ней неразрывное целое. Это можно ви-

деть на фасадах домов № 3 (**рис. 4**) и № 4 (**рис. 5**, фрагмент фасада) по ул. Сакко и Ванцетти. Главный фасад дома № 3 богато декорирован оконными обрамлениями, подоконными нишами, междуэтажной профилированной тягой с сухариками. Оконные проёмы первого этажа прямоугольные, второго – полуциркульные. Своеобразное оживление вносят стилизованные изображения головы льва – маскароны (такие же использованы на доме № 29 по пр. К. Маркса, (**рис. 6**).Второй ярус стен дома № 4 прорезан прямоугольными проёмами и богато декорирован тягами, наличниками, лопатками. Для достижения большей художественной выразительности верхние угловые части стен украшены декоративными элементами. Оконные проемы первого этажа имеют полуциркульное очертание, стены прорезаны рустом.

Принцип построения орнаментальной пластики, сочетания составляющих узор элементов основан, подобно орнаменту, на закономерностях ритма и симметрии. Композиционно организованные повторяющиеся элементы могут состоять из геометрических форм, растительных узоров, изображений птиц, животных, людей и фантастических образов. Для орнаментальной пластики типично лентообразное или ковровое заполнение плоскости с чётким метрическим чередованием однотипных форм или изображений, как правило, взаимосвязанных с основными композиционными осями фасадов. Она дополняет и художественно усиливает структурную пластику, размещаясь в наиболее композиционно ответственных частях здания. Среди пластических деталей встречаются и строгие прямолинейные членения и причудливые кронштейны, классический акантный лист, узорные ленты фризов. Ярким примером использования орнаментальной пластики эклектизма является дом № 29 по пр. К.Маркса. Уличный фасад богато декорирован элементами, набранными из фигурного кирпича (подоконные ниши и кронштейны, междуэтажный поясок, обрамления окон, пилястры и тд.). На плоскости стены присутствуют и скульптурные украшения- маскароны, узоры растительного орнамента. Это типовые элементы заводского изготовления, однако они по- своему характеризуют богатство средств и возможностей при оформлении зданий к. XIX – н. XX вв. (**рис. 6** – обрамление оконного проема, маскарон).

В создании художественного образа городской застройки важную роль играл и архитектурный стиль модерн. Железо, сталь, железобетон, большемерное стекло, новые строительные конструкции, широко входившие в архитектурную трактовку, были одной из важных предпосылок для формирования на рубеже XIX-XX вв. рационалистической архитектуры. Сторонники модерна призывали к пересмотру всех аспектов архитектуры и полному отказу от художественных традиций. Здания этого стиля не надо

было вписывать в привычные симметричные композиционные схемы, их планы формировались свободно, исходя из целесообразности размещения помещений и их групп, вследствие этого свободными и живописными стали объемно-пространственные структуры зданий. Домовладельцы стремились обязательно выделить свое здание индивидуальным оформлением, придать ему наивысшую архитектурную репрезентативность и импозантность. С этой целью пластика уличного фасада обогащалась разнообразной компоновкой консольно нависающих эркеров, балконов, креповки ризалитами, нишами, угловой обрезкой, фонариками, куполами, окнам придавалась различная конфигурация. Все эти нововведения резко изменили внешний вид зданий, придавая им индивидуальный архитектурный облик.

Начался модерн с полного отказа от каких бы то ни было традиций, позднее стали использоваться формальные элементы исторической архитектуры, сильно изменённые и в сочетании с новаторскими приёмами. В так называемом стилизаторском модерне находили применение некоторые традиционные элементы композиций и форм, но значительно и произвольно переработанные, а также с совершенно новыми чертами. Если в основе эклектики лежал порядок, базирующийся на сознательном отборе прошлых столетий, то основу модерна составлял индивидуализм композиций. Приметы нового стиля можно увидеть на фасаде дома № 1 по пр. К. Маркса. (**рис. 7**) – полукруглые балкончики, декоративные элементы. Само здание представляет собой двухэтажный объем с мезонином и полуподвалом. Мезонин завершается треугольным фронтоном. Окна первого и второго этажей акцентированы сандриками.

Модернистской художественно-стилевой трактовкой отличается дом № 9 по пр. К. Маркса (**рис. 8**), решённый угловым трёхэтажным объёмом. На фоне ритма прямоугольных окон выделяется скошенная угловая часть, которая выступает консольно подвешенным эркером, полукруглым в плане, завершённым аттиком сложной конфигурации. Использование углового эркера в подобных зданиях становится почти обязательным и не столько из-за их внутренней планировочной организации, сколько с точки зрения создания архитектурной доминанты, которая должна акцентировать городской перекрёсток. Восточный и южный фасады здания оформлены прямоугольными в плане эркерами, завершёнными криволинейными стилизованными фронтонами.

Несмотря на то, что в небольших городах архитектура отличалась некоторой упрощённостью, эклектически-стилизованным характером, представленным преимущественно формами регионального зодчества,

пластика экстерьера большинства домов, выстроенных в г. Полоцке на рубеже XIX-XX вв., органично сочетается с конструктивно-пространственной структурой зданий и является своего рода продуктом материальной и духовной культуры эпохи.

**Литература**

1. **Горюнов В.С. , Тубли М.П.** Архитектура эпохи модерна. СПб.: Стройиздат. 1992.

2. **Гуляницкий Н.Ф.** История архитектуры. Т.1. М.: Стройиздат. 1984.

3. **Даркевич В.П.** Путями средневековых мастеров. М. 1992.

4. **Кириченко Е.И.** Русская архитектура 1830-1910-х годов. М. 1978.

5. **Кулагін А.М.** Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст. Мн.: Ураджай. 2000.

6. **Памятники архитектуры в структуре городов СССР**./ Под ред. А.В. Иконникова, Н.Ф. Гуляницкого. М.: Стройиздат. 1978.

7. **Тиц А.А. , Воробьева Е.В.** Пластический язык архитектуры. М.: Стройиздат, 1986.



**Рис. 1.** Дом № 8 по ул. Войкова.



**Рис. 2.** Дом № 5 по пр. К. Маркса.




**Рис. 3.** Дом № 7 по ул. Энгельса.



**Рис. 4.** Дом № 3 по ул. Сакко и Ванцетти.



**Рис. 5.** Дом № 4 по ул. Сакко и Ванцетти. Элементы декора.




а

б

**Рис. 6.** Дом № 29 по пр. К. Маркса. Элементы декора.




**Рис. 7.** Дом № 1 по пр. К. Маркса.




**Рис. 8.** Дом № 9 по пр. К. Маркса.

# Полоцкий укреплённый район: формирование и боевая деятельность

*С.И. Поляков*

Укреплённый район (УР) – полоса или район местности, оборудованные системой долговременных и полевых фортификационных сооружений в сочетании с различными инженерными заграждениями, подготовленный для длительной и упорной обороны специально предназначенными войсками самостоятельно или во взаимодействии с общевойсковыми частями[1].

По приказу Главкома Вооруженных Сил Республики № 312 от 11.09.1918 года началось создание Западного района обороны. Тогда в его состав вошли Псковская и 17 стрелковые дивизии, а также части пограничной охраны со штабом в Смоленске[2].

После прекращения военных действий на советско-польском фронте в 1920 году вопрос об укреплении западной границы встал ещё более остро.

В районе Полоцка, который располагался в непосредственной близости от государственной границы, силами Западного Военного округа проводилось инженерное оборудование приграничной полосы.

В 1928 году РВС СССР принимает решение о строительстве Полоцкого, Минского и Полесского УРов. Самым мощным и насыщенным фортификационными сооружениями и огневыми средствами должен был стать Минский укрепрайон. Кроме частей округа, специалистов-фортификаторов в строительстве УРов участвовали коллективы многих предприятий. Гранит везли с Украины, арматурную сталь с Урала, бронеколпаки и амбразурные заслонки отливали в Ленинграде.

Строительство Полоцкого УРа длилось почти 10 лет, и было в основном завершено к 1935 году. Основные инженерные сооружения располагались по восточному берегу Западной Двины. Полоцкий УР прикрывал великолукское направление. Его протяженность по фронту достигала 70 километров.

Накануне Великой Отечественной войны Полоцкий УР организационно включал в себя 5 пулеметно-артиллерийских батальонов, подразделения обеспечения и обслуживания. Каждый ДОТ – долговременная огневая точка (а их было от 50 до 70) занимало подразделение из 10-12 человек. Имелись ДОТы, предназначенные для ведения артиллерийского и пулеметного или только пулеметного огня. В ДОТах устанавливались 105 мм. морские пушки 1906 года. Каждый ДОТ имел 2-3

[1] Военный энциклопедический словарь. М.: Воениздат. 1984.

[2] Краснознаменный Белорусский военный округ. М.: Воениздат, 1983.

вынесенные в стороны пулеметные бойницы. Броневая и бетонная защита надежно укрывали обороняющихся от воздействия авиации и огня основных артиллерийских систем.

Оборудование Полоцкого и других укрепрайонов на западной и восточной границах СССР осуществлялось по проектам знаменитого советского военного инженера **Карбышева**, который в то время был преподавателем академии ГШ.

В 1931 году командующим БВО назначается командарм **Иероним Уборевич**. Он внес заметный вклад в укрепление западной границы и строительство укрепленных районов, в том числе и Полоцкого. В своих воспоминаниях участник строительства Полоцкого УРа инженер-полковник **Гончаров** пишет: "Поехал он под Полоцк, где шли инженерные работы по укреплению района. Взял и меня с собой. Перед нашим приездом геодезисты закончили разбивку местности и определили, где следует располагать огневые точки. Везде были расставлены вехи. Уборевич прошел несколько километров. придирчиво осматривая работу геодезистов. Вдруг остановился. Как вы думаете – обратился ко мне – будет обстреливаться этот овраг или это пространство окажется мертвым? Надо бы проверить – неопределенно ответил я. Вот и давайте проверим! Он лег на землю и пополз к контрольному колышку. Убедившись в правильности разбивки, облегченно вздохнул"[3].

В ноябре 1939 года в связи с изменением западной границы было решено оставшиеся в тылу УРы упразднить, их боевые сооружения законсервировать. При этом намечалось развернуть строительство 20 новых УРов (около 2000 ДОТов). Их возведение велось высокими темпами, но объем оборонительных работ был велик, и промышленность не успевала обеспечивать новые УРы материалами, оборудованием и вооружением. После долгих споров было принято решение демонтировать часть вооружения из старых УРов.

Генеральный штаб предлагал "в расчёте сил и средств и планов работ учесть железобетонные сооружения, построенные в 1938-39 годах в Минском, Полоцком и Мозырском УРах."[4]

Опыт начавшейся Мировой войны показал возможность глубоких прорывов подвижных войск противника. Поэтому весной 1941 года Главным Военным Советом было решено старые УРы сохранить как рубежи оперативной обороны и содержать их в боевой готовности. Мобилизационная готовность для них устанавливалась "4+10 дн.". К 22 июня 1941 года привести старые УРы в боевую готовность не удалось.

Накануне войны Полоцкий УР был укомплектован личным составом только наполовину (около 500 человек). Почти все артилле-

---

[3] Командарм Уборевич. М.: Воениздат. 1964.

[4] Г.К. Жуков. Воспоминания и размышления. Т. 1. М.: АПН, 1979. – с. 214-215.

рийское вооружение было демонтировано. Возглавлял укрепрайон человек неординарный и высокообразованный – полковник **Деви Николай Сергеевич**. Он родился в 1898 году, окончил Пермское реальное училище, учился на юридическом факультете Петербургского университета, владел немецким и французским языками, был участником 1 мировой и гражданской войн. В 1936 году был назначен начальником штаба 50-ой стрелковой дивизии в Полоцком УРе. Привлекался к следствию по "делу Тухачевского", но, к счастью, репрессирован не был[5].

По воспоминаниям в письме дивизионного инженера 174 СД Венедикта Аполлоновича Иванова полковник Деви был храбрым, знающим и опытным военным специалистом, он знал УР до мельчайших подробностей. Погиб Деви в сентябре 1941 года в районе Пенно Калининской области.

И, видимо, удачно сложились обстоятельства, которые свели на полоцкой земле трех умелых военных специалистов - полковника Деви, майора Колоколова (командарма 390 артиллерийского полка 17 СД) и командира 174 СД комбрига Зыгина. Это благодаря их военному таланту, мужеству и инициативным действиям "Полоцкий укрепрайон один из немногих выполнил в полном объеме возложенную на него задачу"[6].

Полоса обороны Полоцкого УРа стала основой обороны 174 СД, первые эшелоны которой прибыли в Полоцк 27 июня 1941 года, а 29 июня вступили в боевое соприкосновение с частями вермахта.

Оборона Полоцка велась с 27 июня по 16 июля 1941 года соединениями и частями 22 армии, развернувшимися от Краславы в Латвии до Витебска. В центре от Двины до Уллы, включая 42 км полосы Полоцкого УРа, оборонялась 174 СД комбрига Зыгина.

29 июня приказом командующего 22 армии был образован Полоцкий боевой участок, начальником которого стал Зыгин. В состав участка вошел и Полоцкий УР с системой ДОТов и 5-ю пулеметными батальонами неполного состава.

Па рубеже Островщина-Вороничи-Гомель части дивизии Зыгина. 390 АН и УР преградили путь немецкой 3-й танковой группе, рвавшейся к Полоцку. В течение 10 дней немцы вели непрерывные атаки, пытаясь овладеть Полоцком с фронта. Не сумев этого сделать, немцы 7-9 июля перенесли основные удары в обход Полоцкого УРа, оставив часть сил и средств для продолжения фронтального наступления.

Противнику удалось форсировать 3. Двину в районе Дисны и Уллы. Части 174 СД и Полоцкого УРа вынуждены были вступить в тяжелые фланговые бои.

---

[5] Во славу Родины. 22.01.1992.

[6] из письма дивизионного инженера 174 СД В.П. Иванова.

Несмотря на контрудары войск 174 СД и УРа, несмотря на героизм защитников Полоцка, враг, имея 3-4 кратное превосходство в силах, прорывает оборону 174 СД на флангах и устремляется в обход Полоцка к Невелю.

В это время на Смоленской земле самое большое сражение начального периода войны, длившееся 2 месяца – смоленское. Его итогом стал переход группы армий “Центр” к обороне. Основные силы 3-й танковой группы, которую предполагалось бросить на Ленинград, были скованы на западном направлении[7].

Героизм воинов 174 СД и Полоцкого УРа, сдерживавших почти 20 дней наступления дивизий 3-й танковой группы Гота. Вынудил врага уже в июле использовать на западном направлении почти половину своего стратегического резерва (10 из 24 дивизий).

В характеристике боевого состояния 174 СД, направленной Военным Советом 22 армии командующему Западным фронтом Тимошенко, говорится:

“Личный состав дивизии проявлял и продолжает проявлять исключительное упорство. Особенно жестокие бои дивизия вела у Берковичей и Боровухи-1, где в день отбивала по 4-5 атак. Под Боровухой уничтожено до 2000 фашистов. Как дивизия, так и её командир комбриг Зыгин заслуживают быть отмеченными”.

За оборону Полоцка 2 человека из состава дивизии были награждены орденами Ленина – комбриг **Зыгин Алексей Иванович** и командир батальона 628 СП **Кочнев Александр Иванович**.

Следует отметить, что командиры дивизий в июле 1941 года орденами награждались крайне редко.

К середине июля 1941 года создалась угроза полного окружения и уничтожения войск Полоцкого боевого участка.

По приказу командующего 22 армией в ночь на 16 июля 1941 года войска Полоцкого УРа, 174 СД, 390 АП начали отход в направлении Дретунь-Невель, но еще несколько дней, как говорят очевидцы, не смолкали ДОТы Полоцкого УРа.

В 1974 году в издательстве “Молодая Гвардия” была выпущена книга Акимова “Баллада об ушедших на задание”. В книге 2 повести, одна из которых называется “Дот”.

По сюжету четверо красноармейцев, бежавших из плена, попадают в ДОТ и на несколько дней задерживают продвижение немецкой механизированной дивизии. В повести нет точных географических названий и подлинных имен, но вполне возможно, что такие события могли произойти на полоцкой земле. Ведь сколько их безвестных героев войны. И сегодня еще напоминают о них развалины ДОТов в окрестностях Полоцка.

---

[7] Великая Отечественная война Советского Союза. М.: Воениздат, 1970. – с. 79.

# Скарб з Лучна

**(2002 ã.)**

***Ю.М. Сакалоў***

Летам 2002 г., недалёка ад Полацка, у вёсцы Лучна, на правым беразе р. Зах. Дзвіны, прыватнымі асобамі быў знойдзены скарб. На жаль, гэты скарб у поўным аб’ёме не трапіў супрацоўнікам НПГКМЗ. Толькі яго частка, хутчэй за ўсё невялікая, знайшла сваё месца ў музейных фондах дзякуючы праваахоўным органам (Полацкаму ГАУС). Гэтыя манеты прадстаўлены 9 літоўскімі і 1 польскім паўгрошамі, плацёжнымі сродкамі, распаўсюджанымі на тэрыторыі ВКЛ і Польшчы ў XVI ст. Іх агульная вага складае 10,9 г., з іх 3,3 г. – серабро. Гэта значыць, што дадзеныя манеты чаканіліся з білону (нізкаякаснае серабро).

Манетныя скарбы вельмі спецыфічныя помнікі, якія адлюстроўваюць склад і заканамернасці грашовага абарачэння, міжнародныя, палітычныя і культурныя сувязі таго ці іншага рэгіёну ў адпаведны час. Але абмежаваная колькасць скарбаў на гэтыя пытанні адказаць няздольная. Толькі фіксацыя кожнага з іх максімальна наблізіць нас да разумення тых складаных эканоміка-палітычных працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі вывучаемага рэгіёну. Акрамя таго, кожны скарб па-свойму унікальны, бо нельга знайсці два падобныя адзін да аднаго скарбы.

Як ужо адзначалася вышэй скарб складаецца з 10 манет: 9 літоўскіх і 1 польскага паўгрошаў. Літоўскія паўгрошы чаканіліся ў Вільні, польскія – у Кракаве. Гэтыя гарады напрыканцы XV ст. і да канца 70-х гадоў XVI ст. з’яўляліся цэнтрамі грашовай эмісіі ВКЛ і Каралеўсва Польскага адпаведна. У гэты час склалася асноўная адметнасць літоўскіх паўгрошаў ад польскіх, як у вазе і памерах, так і ў знешнім афармленні. Кошт польскага паўгроша складаў 4/5 кошту літоўскага паўгроша. Чаканка розных, хаця і саюзных дзяржаў не магла не адбіцца на знешнім афармленні разглядаемых манет. На літоўскіх паўгрошах прысутнічае акрамя герба ВКЛ – “Пагоні” і герб Каралеўства Польскага.

З чым жа звязана з’яўленне дадзенага скарбу? Перш за ўсё трэба заўважыць, што захоўванне ў зямлі грашовых сродкаў, было даволі распаўсюджанай з’явай, як на тэрыторыі ВКЛ, так і ў іншых дзяржаў. Але больш актыўна скарбы ствараліся ў момант вайсковай пагрозы. І лучанскі скарб таму прыклад. Чаму?

- Па-першае, у лучанскім скарбе самая маладая манета датавана 1562 г. Вядома, што ў пачатку 1563 г. войскі маскоўскага цара Івана Жахлівага ўзялі ў аблогу Полацк. І пакуль асноўнае войска знаходзілася пад сценамі горада, асобныя атрады рабавалі Полацкае Падзвінне. 15 лютага 1563 г.

полацкі ваявода Станіслаў Давойна згадзіўся на капітуляцыю, і горад 16 гадоў знаходзіўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы. З гэтага можна зрабіць выснову, што манета маладзейшая за 1562 г. фізічна не магла трапіць у разглядаемы скарб.

- Па-другое, неабходна прывесці ўскосны доказ таму, што гэта не быў скарб накапляльны. У нумізматыцы існуе закон Каперніка-Грэшыма. Згодна з ім добрыя манеты адразу выключаліся з абарачэння і доўгі час захоўваліся ўладальнікам, перадаваліся ў спадчыну і гэтак далей. І толькі калі ўладальнік трапляў у складанае становішча, ён карыстаўся імі. А гэты скарб складаецца з распаўсюджаных білонавых манет. Прычым некаторыя знаходзяцца ў дрэнным стане, г. зн. не адзін год пераходзілі з рук у рукі. Такія манеты ўладальнік збываў у першую чаргу, бо збіраць іх не было ніякага сэнсу.

**1.** Манета разменная наміналам паўгрош. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Аляксандр Ягелончык (1492-1506). Серабро: 300°-400°, 0,27 г.; д. 21,6 мм., агульная вага манеты – 0,9 г.

**2.** Манета разменная наміналам паўгрош. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – кароны, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Польшча (каралеўства) Аляксандр Ягелончык (1501-1506). Серабро: 300°-400°, 0,27 г.; д. 17,8 мм., агульная вага манеты – 0,9 г.

**3.** Манета разменная наміналам паўгрош 1512 г. На аверсе рэльефная выява герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,30 г.; д. 19,5 мм., агульная вага манеты – 1,0 г.

**4.** Манета разменная наміналам паўгрош 1561 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,30 г.; д. 19,5 мм., агульная вага манеты – 1,0 г.

**5.** Манета разменная наміналам паўгрош 1547 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,36 г.; д. 19,5 мм., агульная вага манеты – 1,2 г.

**6.** Манета разменная наміналам паўгрош 1562 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,33 г.; д. 19,5 мм., агульная вага манеты – 1,1 г.

7. Манета разменная наміналам паўгрош 1561 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,30 г.; д. 20,0 мм., агульная вага манеты – 1,0 г.

8. Манета разменная наміналам паўгрош 1561 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,36 г.; д. 19,0 мм., агульная вага манеты – 1,2 г.

9. Манета разменная наміналам паўгрош 1561 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,36 г.; д. 19,0 мм., агульная вага манеты – 1,2 г.

10. Манета разменная наміналам паўгрош 1562 г. На аверсе рэльефная выява дзяржаўнага герба Каралеўства Польскага; на рэверсе – Вялікага княства Літоўскага, вакол якіх – кругавая легенда. Гурт гладкі. Вялікае княства Літоўскае. Жыгімонт II Аўгуст (1545-1572). Серабро: 300°-400°, 0,36 г.; д. 20,0 мм., агульная вага манеты – 1,2 г.

У заключэнні трэба звярнуць увагу на грашовую значнасць лучанскага скарбу для тагачасных жыхароў ВКЛ. У вялікакняскім “Уставе” ад 5 чэрвеня 1508 г. знаходзіцца пералік фіксаванага рыначнага кошту: вол каштаваў 30 польскіх або 24 літоўскіх грошаў (48 паўгрошаў), баран – 2,5 польскіх гроша, або 2 літоўскіх грошы (4 паўгрошы).

# Люстрацыя паезуіцкіх маёнткаў 1774 года – каштоўная малавядомая крыніца па гісторыі Полаччыны другой паловы XVIII ст.

***Н.А. Сяргеенка***

Вывучэнне беларускай гістарычнай літаратуры па тэме навуковага даследвання выявіла існаванне каштоўнага малавядомага дакумента па гісторыі Полаччыны XVIII стагоддзя.

У даследваннях гродзенскага навукоўца, доктара навук Я.Н.Мараша “Ватикан и католическая церковь в Белоруссии. (1569-1795)” /**8**/ і “Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII века” /**9**/ сустракаюцца спасылкі на люстрацыю Полацкай езуіцкай калегіі, якая захоўваецца ў Полацкім музеі. /**9**, с. 42/ На яе спасылаецца і С.В. Тарасаў. /**13**/

Сам рукапіс, “Люстратар Полацкі паезуіцкіх маёмасцей, у архіў ясна асвечанага князя, ягамосці Радзівіла, маршалка генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. C.D.” /**7**/ быў выяўлены толькі ў 2002 г.

Тэкстуальныя, сэнсавая, лічбавыя неадпаведнасці знойдзенага арыгіналу вопіса былых езуіцкіх уладанняў 1774 года і звестак з гэтага дакумента, якія выкарыстоўваюць навукоўцы дазваляюць меркаваць, што арыгінал дакумента, якім мы валодаем, малавядомы навуковай грамадскасці, навукоўцы выкарыстоўваюць недакладны пераклад на рускую мову з дадзенага дакумента.

Між тым, нават першае знаёмства з рукапісам, выяўляе яго істотную каштоўнасць для вывучэння гісторыі Полаччыны і Беларусі другой паловы XVIII ст.

“Lustrator Połocki z Dobr Ex – Iezuickich, ad Archivum J.O. [Jasme Oswicionego] /**2**, c. 127/ Xcia, Jmci. Radziwiłła, Mar.Gener.Konf.:W:X:L. C.D. (*Люстратар Полацкі паезуіцкіх маёмасцей, у архіў ясна асвечанага князя, ягамосці Радзівіла, маршалка генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага C.D.*)

Люстрацыя была складзена к сакавіку 1774 года і знаходзілася у архіве Міхала Гераніма Радзівіла – мечніка. Michola Radziwilla Micirnika /**7**, с.1/, а з 1783 года – члена Адукацыйнай камісіі. /**1**, с. 60/

Матэрыялы люстрацыі уяўляюць сабой рукапісны сшытак памерам – 39,7х25,5 (51,7) см. з 36 старонкамі рукапіснага тэксту, пранумараваных складальнікамі. 21 цэлы і 1 абарваны ліст, былі пранумараваны зноў у XIX ст. століначальнікам Віцебскай Палаты дзяржаўнай маёмасці А. Янушкевічам. Пры напісанні дакумента выкарыстоўвалася чарніла чорнага і чырвонага колераў, графітавы аловак (вядома, што першыя графітавыя

алоўкі пачала вырабляць фабрыка Фабер з 1761 года /**14**, с.216/, магчыма, выкарыстоўванне графітавага алоўка ў гэтым дакуменце – адно з першых вядомых у Полацку і на Беларусі).

Дакумент у кардонным пераплёце, з рэшткамі скураных упрыгажвэнняў. Папера, якая выкарыстоўвалася у люстрацыі – гербавая, мае філіграні двух відаў, іх ідэнтыфікацыя патрабуе больш спецыяльнага вывучэння (**мал. 1, 2**). Дакумент – на польскай мове, з дамешкам беларусізмаў і лацінскіх выразаў. Дата напісання дакумента – не пазней сакавіка 1774 года, аб гэтым сведчыць запіс на старонцы 22 /**7**, с.22-нумарацыя старонак люстратара, тут і далей па арыгіналу дакумента/, і таксама дадзеныя з фальваркаў, якія улічваюць вынікі і запазыкі 1773 года.

К гэтаму часу маёнткі ордэна езуітаў перайшлі ў распараджэнне Адукацыйнай камісіі – установы, якая ажыццяўляла рэформы асветы ў Рэчы Паспалітай /**1**, с. 62/. Люстрацыя – першы вопіс паезуіцкіх фальваркаў, размешчаных на левым беразе Дзвіны, з мэтай вызначэння прыбытковасці былых езуіцкіх уладанняў.

Першы агляд люстрацыі дазваляе меркаваць, што яна стваралася двума перапісчыкамі, магчыма непасрэднымі складальнікамі, і толькі візіравалася спецыяльна прызначаным чыноўнікам Адукацыйнай камісіі – люстратарам Гілярыем Абранпальскім – адным з першых люстратараў Адукацыйнай камісіі /**7**, с. 11/. Асоба люстратара старанна падбіралася сярод здольных людзей і лічылася недатыкальнай, а знявага разглядалася як цяжкае дзяржаўнае злачынства. Люстратар меў паўнамоцтвы ацэньваць зямельную маёмасць, правяраць прыбыткі, выдзяляць грашовую сумму на развіццё гаспадарак, вызначаць памеры выдаткаў, рабіць прапановы перспектыўнага развіцця гаспадарак. Вопіс маёмасці – люстрацыя – рабілась узорам збірання выдаткаў у найбліжэйшы час. Цікава і тое, што вопіс маёмасці езуіцкіх фальваркаў на Полаччыне праводзіўся Адукацыйнай камісіяй у першую чаргу.

Гэты дакумент – частка люстрацыі былых езуіцкіх уладанняў. У нашым распараджэнні маюцца заключныя часткі люстрацыі, пазначанныя літарамі C і D. На жаль, пачатак вопісу (магчыма, часткі A і B), які мусіў мець падрабязныя дадзеныя аб падаткаабкладанні асобных сялянскіх сядзіб гэтых фальваркаў, страчаны.

Частка люстрацыі C – найбольшая па абьёму і мае апісальны характар. Яна ўтрымлівае наступныя раздзелы:

- рэляцыя люстратара аб маёмасцях /**7**, аркуш 1, с.1-6/, дзе даюцца агульныя геаграфічныя і эканамічныя звесткі аб уладаннях;
- рэляцыя аб прэтэнзіях, якія меліся да былых езуіцкіх уладанняў з боку іншых асоб /**7**, аркуш 2, с.7-10/;

- рэляцыя, ці прапановы люстратара па павышэнню прыбыткаў з гэтых уладанняў /**7**, аркуш 3, с. 11/;

Акрамя рэляцый у люстрацыі пад літарай С змешчаны табліцы з лічбавым матэрыялам /**7**, аркушы 4, 7, с. 14, 17, 18, 20/, у якіх даецца паўнаважнае інвентарнае апісанне ўсяго таго, што належыла да гэтых інвентарных уладанняў: гаспадарчых і жылых будынкаў, цэркваў, касцёлаў, корчмаў, абсталявання, прылад працы.

Дакладна вызначаны і абагульнены павіннасці сялян (паншчына – колькасць жаночых і мужчынскіх дзён), якія належылі да 9 пазначаных фальваркавых гаспадарак, разнастайныя грашовыя выплаты, выдаткі ў дзяржаўны скарб. /**7**, с. 14/ Пазначана таксама і агульная колькасць зямлі, якая належала да фальваркаў, дадзена характарыстыка яе якасці. /**7**, с.14/ Падрабязна пералічана па асобных артыкулах усё абсталяванне, ўсе рэчы, што былі ў гаспадарках: коні, падводы, млыны, азёры. /**7**, с. 14/ Рупліва было пералічана ўсё, што уяўляла хаця б нейкую каштоўнасць, у тым ліку збожжа, прадукты харчавання, якія былі там на час стварэння інвентара. /**7**, с. 17/

У люстрацыі выдзелены ў асобную табліцу ўладанні місіянераў – "місійскія" /**7**, с. 14/, магчыма тыя, што належылі да трох місіянерскіх рэзідэнцый, якія знаходзіліся у Экімані, Туроўлі і Загацці. Пазначана колькасць місіянерскіх дымаў (289, у мястэчку Экіманія і Остраў – 121 дым, пасадзе Вяжышчы – 72, мястэчку Копцевічы – 96); /**7**, с.14/

Пазначана колькасць і характарыстыка зямлі, выдаткі, колькасць цэркваў, і іх начынне. /**7**, с. 14/.

У асобную табліцу /**7**, с. 20/ вынесены выдаткі: рэчавыя, харчовыя, грашовыя; якія забяспечвалі пражыванне эканомаў, разнастайнай фальваркавай чэлядзі і дзейнасці чатырох манахаў – місіянераў, у абавязкі якіх уваходзіла пашырэнне каталіцкай веры сярод іншаверцаў.

Частку D утварае "тарыф" з гадавых прыбыткаў і выдаткаў з уладанняў фальваркавых населеных пунктаў, зведзеных у табліцы /**7**, аркуш 8, с. 22-36/. Характэрны лаканічныя звесткі, перавага лічбавага матэрыялу над апісальным.

Табліцы на старонках 24-34 "Люстрацыі паезуіцкіх маёнткаў 1774 года" маюць падрабязныя дадзеныя аб катэгорыях падаткаў кожнага населенага пункта з дзевяці паезуіцкіх фальваркаў: фальваркаў Экіманія, Казімірава, Вяжышча, Туроўля, Іваньск, Межджычы, Мосар, Загацце, Ігуменаў, у склад якіх уваходзіла 26 населеных пунктаў з агульнай колькасцю 1296 дымаў (пры прынятай сістэме падліку 6 чалавек на дым /**4**, с. 467/ гэта 7776 чалавек падатковага насельніцтва (**дадатак № 1**).

Лічбы аб колькасці паезуіцкіх маёнткаў сустракаліся ў навуковай літаратуры. Так даследчык Блінова Т.Б. піша /**5**, с. 38/: "Богатства полоцких

иезуитов, находившиеся в пределах Речи Посполитой, – 9 фольварков, 11 войтовств и 37 деревень, – перешли в ведение Эдукационной комисии” і дае спасылку на працу Мараша “Ватикан и католическая церковь в Белоруссии” /**8**, с. 120/ . Згодна арыгіналу люстрацыі паезуіцкіх маёнткаў дадзеныя абодвух навукоўцаў завышаны. Адукацыйная камісія атрымала 9 фальваркаў, якія складаліся з 26 населеных пунктаў: 2 мястэчак, 1 пасада, 9 войтаўстваў, 14 вёсак.

Памылкова дадзена і колькасць гаспадарак – 1008 /**5**, с. 71/. Гэтая лічба сустракаецца ў арыгіналу люстрацыі, якім мы валодаем, на старонке 14 /**7**, с. 14/. Але ж, па-першае, яна дадзена без уліку “міссійскіх” дымаў, а, па-другое, яна – з арыфметычнай памылкай на адну адзінку аднаго з перапішчыкаў альбо ствральнікаў дадзенай табліцы (132 дымы ў фальварку Іваньск памылкова падлічаны, па “тарыфе” на старонцы 30 /**7**, с. 30/ іх – 131 дым). Па арыгіналу люстрацыі магчыма самастойна падлічыць агульную колькасць дымаў у фальварках – 1296 дымаў, сярод іх асобна азначаны іудзейскія дымы ў пасадзе Вяжышчы – 5 domy (30 чалавек) і выдаткі яўрэйскія ”жыдоўскія” з іх “пляцоў” /**7**, с.27/.

У частцы D люстрацыі прыведзены таксама падрабязныя дадзеныя падымных падаткаў і азначана сістэма падліку грашовых падаткаў (чыншу) з мёду, грыбоў, кур, баранаў, гусакоў і іншага харчавання, якія, магчыма, змянілі дзякла – харчовую рэнту /**7**, с. 24-34/.

Колькасць корчмаў і шынкоў і вялікая арэнда з іх сведчаць аб развіцці камерцыйнага прадпрымальніцтва ў мястэчках. Так, напрыклад, мястэчка Экіманія з Астравам з колькасцю дымаў – 121 (726 чалавек), якія лічыліся місіянерскімі, плацілі арэнду з 16 шынкоў – 120 злотых /**7**, с. 24/.

Вёска – Chochlo – Экіманьскага фальварка давала 400 злотых за арэнду карчмы Пятніцкай пры агульнай сумме даходаў – 1007 злотых 10 грошай /**7**, с. 24/. Агульная колькасць корчмаў ў 9 фальварках, якія былі арэндаваны і ўносілі выдаткі за арэнду - чатырнаццаць /**7**, с. 24-35/. Яны прыносілі даход – 4676 злотых. Але ж у маёнтках захоўваліся і правы вольнай прапінацыі. На с.14 у табліцы маюцца дадзеныя адносна 17 “гасцінных” і 9 іншых корчмаў /**7**, с. 14/.

У табліцах на старонках – 24-35 /**7**, с. 24-35/ стваральнікі люстрацыіі выдзяляюць асобна “няпэўныя” прыбыткі з розных відаў арэнды – з шынкоў у Экіманіі з Астравам, усе выплаты з “заложанай” вёскі Хацэвічы таксама падлічаны як “няпэўныя” /**7**, с. 25/, за арэнду возера ў Тураўлянскім фальварку, садоў, за сена – агульная лічба “няпэўных” выплат падлічана ў табліцы на старонцы 36 /**7**, с. 36/. Спалучаючы гэтае імкненне стваральнікаў люстрацыі з апісаннем прапаноў па павелічэнню прыбыткаў у рэляцыі часткі С і з дэталёвым вылучэннем усіх маёмасных прэтэнзій да маёнткаў, бачым жаданне люстратара ўдасканаліць і зафіксаваць усе магчымыя пер-

спектывы павелічэння грашовых прыбыткаў.

Полацкая люстрацыя паезуіцкіх маёнткаў 1774 года завершана выніковай табліцай, якая суміруе прыход, расход і канчатковы прыбытак з 9 фальваркаў. Выдаткі на выплату дзяржаўных падаткаў у суме з выдаткамі на ўтрыманне фальваркаў выдзелены паасобна /**7**, аркуш 8, с.36/. Яны складалі – 4509 злотых 2 грошы. У гэтай жа апошняй табліцы дадзены лічбы агульнага прыбытка з 9 фальваркаў – 68392 злотых 6 і 7/24 гроша, а пасля выплаты падаткаў і выдаткаў на ўтрыманне гаспадарак і ў суме з “няпэўнымі” выдаткамі за арэнду, якія не патрабавалі больш ніякіх выплат, – 63882 злотых 4 і 7/24 гроша.

Каля 64 тысяч злотых у год атрымлівала Адукацыйная камісія з паезуіцкіх маёнткаў Полаччыны.

Такім чынам, былыя уладанні Полацкіх езуітаў – Экіманія, Казімірава, Вяжышча, Туроўля, Іваньск, Межджычы, Мосар, Загацце, Ігуменаў у 1773-1774 гг. прыносілі звышпрыбыткі і маглі з’явіцца “эканамічным падмуркам” адукацыйнай рэформы Рэчы Паспалітай.

Хаця матэрыялы люстрацыі захоўваюць вялікую колькасць звестак па усёй Полаччыне, засяроджвае ўвагу апісанне гарадской тэрыторыі левабярэжнай часткі Полацка, якая ўваходзіла ў склад горада з XII стагоддзя – слабада Экімань і слабада Востраў. К другой палове XVIIIст., пасля спынення войнаў з Расіяй, і ў выніку актыўнага ўцягвання рэгіёна ва ўнутраны рынак краіны – гэта адзіны адміністраціўна – гаспадарчы цэнтр фальварку Экіманія – мястэчка Экіманія з Остравам /**7**, с. 24/.

У апісальных частках люстрацыі сустракаюцца цікавыя разнастайныя звесткі – “Екіманія мястечко таго ж імені, і слабада Остров, па прежнему Места Полоцкае над Дзвіной расположено”. “Уздоўж Дзвіны на 2 мілі. Ушыр яны на мілі едну, а месцамі болей ці меней…”. У інвентару даецца далей прывязка Экімані да Кубліч і Ушач. “Мястэчка Экіманія мяла здаўна і у заможных мяшчанаў мяла сваі выганы, лясы і правы вольнай прапінацыі, па даўніх прывілеях”. /**7**, с. 2-3/

Наступныя цікавыя звесткі: “…мястэчка гэта пры абразцовай Расійскага салдата абыходжання прыйшло да цалкам мізернага стану. Мае касцёл драўляны … рэзідэнцыю для ксяндза. Мае і царкву парафіяльную. А так сама вялікі заезджы дом з склепамі мураванымі і стадоламі, але яны спусташоныя, з прычыны утрымання там расійскага лазарету. Ляжыць тоя мястэчка ад слабады Бельчацкай … у 1/4 мілі.” /**7**, с. 3/

Люстратар таксама азначае добрыя ўмовы развіцця ўсяго фальварку Экіманія, геаграфічнага і эканамічнага плану, для стварэння у Экімані школ – маецца магчымасць мець вялікія прыбыткі. Да гэтага фальварка акрамя мястэчка Экіманія “належаць вёскі Палудавічі; вёска ў каторай кляштар з

рэзідэнцыяй місіянераў 4 мілі ад Полацка; к Дзісне вёска Ушач – Петрышчанская пад іменем Салатек і Валовек мілі 2; также к Дзісне вёска заложаная Хацевічі мілі 4 належыць архібіскупам Варонечам /**7**, с. 3/"(**дадатак № 2**).

Дадзеныя табліц на старонках 24-25 /**7**, с. 24-25/ таксама дазваляюць удакладніць шэраг агульных звестак аб фальварку Экіманія. Асноўныя выдаткі з 265 фальваркавых дымаў (1590 чалавек) леваберэжнай часткі Полацка складалі – 6890 злотых 21 грош і 1/2, і налог "няпэўны" – арэнда – 848 злотых і 10 грошай.

У табліцах таксама дадзены назвы і колькосць корчмаў у фальварку Экіманія – Пятніцкая, Хоцевічская, Палюдавічская – плацілі за арэнду /**7**, с. 24-25/ і адна карчма была, магчыма, прыватная альбо вольная (гэта вядома з табліцы на ст.14, у фальварку Экімань пазначаны 4 карчмы і 3 "гасцінных", 1 іншая /**7**, с. 14/. Відавочна, што гэта не самы густанаселены і даходны фальварак з 9 азначаных.

Такім чынам, левабярэжная частка Полацка, значна спустошаная, мела статус мястэчка пад назвай Экіманія з колькасццю насельніцтва каля 700 чалавек, уключала ў склад востраў і мела значны патэнцыял у камерцыі, даходы з якой, таксама, як і даходы з сельскай гаспадаркі фальваркаў Полаччыны, накіроўваліся на развіццё свецкай адукацыі і рэформаў асветы Рэчы Паспалітай.

У матэрыялах люстрацыі змешчаны цікавыя звесткі ў прапановах люстратара Гілярыя Абранпальскага аб павелічэнні прыбыткаў паезуіцкіх уладанняў /**7**, с. 11/.

"Аркуш 3, с. 11. О способах павелічэння прыбыткаў фальваркавых ад дворных промыслаў і ад паменьшэння выдаткаў.

- павелічэнне скарбовых прыбыткаў … залежыць ад вылучэння поданых з крайняга убоства, якое ці з-за недахопу зямлі, ці з-за дрэннага кіравання, ці з-за таго адбываецца, што убогіе людзі пазычаюць у зімку збожжа, вяртаючы ў 1,5 разоў боле… (т.ч.) …нада прывесці у парадак падаткі ў саадносінах з колькасцью зямлі.

- акрамя таго, ў падтрымку подданых, мець па льготных умовах выдаваць 1,5 бочкі солі, 2 лемеха (на соху), па 1 коню , па 12 ... тытуню па самых танных ценах … прадаваць.

- а прапінацыях – …павялічэнне прыбыткаў, адчыняць шынкі, дяржаць валоў – как можно больш… (мець таварныя склады, садзейнічаць распаўсюджванню картофеля і хмеля)." /**7**, с. 11/

Такім чынам, каштоўныя звесткі матэрыялаў "Люстратара Полацкага паезуіцкіх маёмасцей …" даюць магчымасць пры параўнанні з іншымі інвентарамі Адукацыйнай камісіі прасачыць дынаміку развіцця Полацкага рэгіёна, які ўваходзіў у склад Рэчы Паспалітай:

раскрыць асаблівасці заняткаў насельніцтва;

атрымаць інфармацыю аб населеных пунктах, колькасці цэркваў, дымаў;

уявіць нацыянальны склад жыхароў рэгёну – гэта каштоўная крыніца па гісторыі Полаччыны другой паловы XVIII ст.

Дзякуючы дадзенаму дакументу прагледжываецца сувязь паміж рэформамі Адукацыйнай камісіі і Полаччынай, той яе часткай, якая ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, да спынення дзейнасці школ і вучылішчаў Піярскай навучальнай акругі ў 20-я гады XIX ст. і ўваходжанню навучальных устаноў Полаччыны ў склад адукацыйнай сістэмы Расійскай Імперыі, якая пачала выконваць задачы па русіфікацыі і асіміляцыі насельніцтва краю.

Трэба пазначыць і тое, што дадзены дакумент не ўваходзіць ані ў 3-х томнае выданне дакументаў “Белоруссия в эпоху феодализма”, ані ў серыйнае выданне беларускіх інвентароў “Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII-XVIII вв.”, ані ў іншыя зборнікі.

Такім чынам, безумоўна патрэбна выяўленую люстрацыю уводзіць у навуковы зварот.

Магчыма выкарыстоўваць рукапіс 1774 года ў экспазіцыі музея гісторыі горада.

Новыя звесткі з люстрацыі магчыма выкарыстоўваць у аглядных экскурсіях па гораду. Неабходна, каб гісторыя левабярэжнай часткі Полацка, старажытных пасадаў арганічна ўваходзіла ў развіццё інфраструктуры горада – запаведніка.

Патрэбна ўдасканаліць звесткі ў кнізе “Памяць. Полацкі раён”/**10**, с. 692/, зрабіць спробу знайсці часткі люстрацыі А і В, і вывучаць далей.

**Літаратура**

1. **Беларуская гістарычная энцыклапедыя**. Т1. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993.

2. **Беларуская гістарычная энцыклапедыя**. Т5. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1999.

3. **Беларуская гістарычная энцыклапедыя**. Т6. Мн., Беларуская Энцыклапедыя, 2001.

4. **Белоруссия в эпоху феодализма**. Т1. Мн.: Академии наук БССР, 1959.

5. **Блинова Т.Б.** Иезуиты в Белоруссии. Мн.: Беларусь, 1990.

6. **Живописная Россия** . Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993.

7. **Люстратар Полацкі паезуіцкіх маёмасцей**, у архіў ясна асвечанага князя, ягамосці Радзівіла, маршалка генеральнай канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. C.D. Полацк: заходняя частка. Рэч Паспалитая, рукапіс, 1774. НПГКМЗ – **КП-17 № 20222**.

8. **Мараш Я.Н.** Ватикан и католическая церковь в Белоруссии. Мн.: Вышэйшая школа, 1971.

9. **Мараш Я.Н.** Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII века. Мн.: Вышэйшая школа, 1974.

10. **Памяць. Полацкі раён**. Мн.: Вышэйшая школа, 1999.

11. **Ревизия полоцких владений**, ранее принадлежавших ордену иезуитов. Полацк, ксеракопія, 1973(?). (НПГКМЗ – Архіў КМ)

12. **Статут Вялікага княства Літоўскага** 1588. Мн.: Беларуская савецкая энцыклапедыя,1989.

13. **Тарасаў С.В.** Полацк IX-XVIII стст. Гісторыя і тапаграфія. Мн.: Беларуская навука, 1998.

14. **Я познаю мир – Химия**. М.: АСТ,1996.

**Дадатак № 1**

*На с. 24-35 арыгінала люстрацыі прадстаўлены назвы населеных пунктаў паезуіцкіх маёнткаў і колькасць дымаў у іх*:

2 мястэчкі
Экіманія з Астравам – 121 дым – у фальварку Экіманія,
мястэчка Капцэвічы – 96 дымаў – у фальвараку Іваньск;
пасад Вяжышча – 72 дыма – у фальварку Вяжышча;
9 войтаўстваў, ўсяго 561 дым – у фальварках
Межджычы, Мосар, Загацце, Ігуменаў;
14 вёсак, 446 дымаў – у фальварках Экіманія,
Казімірава, Туроўля, Іваньск.

**Дадатак № 2**

*Назвы, колькасць дымаў, колькасць жыхароў у фальварку Экімань* (7, с. 24).

Miasteczko Ekimania z Ostrowem (121 дым-726)
Chochło, y Piatnicko (76-456)
Sałatki y Walowki (20-120)
Paludowicze (29-174)
Chocicjewicze (19-114)



**Мал. 1.** Філігрань – герб Горн.




**Мал. 2.** Філігрань – літарныя спалучэння (FE) пад каронай.

# Отражение экономического сотояния Полоцка в почтовой графике

*Ю.И. Тисленко*

С развитием фотографии и печатной техники, с распространением железных дорог и значительным увеличением количества туристов в конце XIX – начале XX веков особую популярность приобрели иллюстрированные почтовые открытки с видами живописных пейзажей, исторических достопримечательностей городов.

В 1874 году на Всемирном почтовом конгрессе в Берне 22 государства-участника утвердили Всемирный почтовый союз. В него вошли: Австро-Венгрия, Бельгия, Великобритания, Германия, Греция, Дания, Испания, Италия, Люксембург, Нидерланды, Норвегия, Португалия, Россия, Румыния, Сербия, Турция, Черногория, Швейцария, Швеция, Соединенный Штаты Северной Америки и Египет. Тогда же была подписана всеобщая почтовая конвенция, предусматривающая единый междугородный формат открытки – 90х140 мм. (с 1925 года – 150х105 мм.).

Первые почтовые открытки (“Открытое письмо”) представляли собой листовое издание установленного формата, одна сторона которого предназначалась для адреса, другая для открытого письма. Постепенно издатели пришли к украшению почтового бланка: в одном из верхних углов карточки печатался скромный монтаж из нескольких характерных видов городов. Например, помещались небольшого формата снимки какого-нибудь памятника известному человеку либо событию, церкви, моста, городского здания. Но вскоре изображение города, местности или архитектурного памятника целиком заняло одну из сторон почтовой карточки. С беспристрастностью и непосредственностью на видовой открытке зафиксировано все вплоть до мельчайших подробностей: вывески магазинов, движущийся транспорт, люди. Эти, казалось бы, случайные детали и передают живую атмосферу времени, как будто окно в другую эпоху.

Почтовые открытки печатались со снимков местных фотографов. В начале XX столетия их можно было купить не только в книжных магазинах и киосках, но и прямо в фотографических мастерских. Открытки печатались фототипией, литографией и непосредственно на фотобумаге. Тогда выпускалась бумага размером почтовой открытки с нанесенными линиями для адреса, на ней было помечено место для письма и для марки. Продавалась даже готовая бумага с надписью “Открытое письмо”. Если же такой подписи не было, тогда некоторые фотографы сами ее допечатывали на обратной стороне снимка. Таким образом, снимок становился почтовой

фотооткрыткой. Оставалось только наклеить марку и написать адрес.

Если собрать коллекцию всех почтовых открыток с видами Полоцка, изданных в первой четверти XX столетия, то это будет своеобразная энциклопедия исторического прошлого нашего города.

Изучая снимки города по коллекции открыток, можно дать точное описание застройки города, отдельных улиц, площадей, наличие и состояние на тот момент архитектурных памятников, развитие промышленности, торговли, транспорта, культурно-бытовой уровень населения.

Например, из архивных документов мы знаем, что в канун первой мировой войны в Полоцке функционировали следующие предприятия, состоявшие на учете фабрично-заводской инспекции: лесопильно-бочарный и лесопильный заводы (125 рабочих), мукомольная и круподельная паровая мельница (25-30 рабочих), табачно-махорочная фабрика (28-30 рабочих), кирпичный завод (11 рабочих), фабрика бетонных изделий (11 рабочих), спичечная фабрика (11 рабочих), завод сельтерских вод (11 рабочих), спиртоочистительный завод (9 рабочих). /**9**/

В 1912 году в центре города была построена небольшая частная электростанция. Мощность электростанции составляла несколько десятков киловатт, что позволяло обеспечить электроэнергией дома в центре города. Станция имела один двигатель и генератор /**3**/. В рукописи Дейниса И.П. “Полоцк в XX веке (1905-1967 гг.)” (**КП5-2774**) владельцем этой электростанции указывался один человек по фамилии “Тепуятников”. Но к счастью, в 1997 году был найден архив предпринимателя Ильмера, в котором оказалась фирменная почтовая карточка, отпечатанная в полоцкой типографии Клячко, с надписью: “ПОЛОЦКАЯ ЦЕНТРАЛЬНАЯ ЭЛЕКТРИЧЕСКАЯ СТАНЦІЯ // А. и Г. Тендѣтниковыхъ и Б. Хейна”, из которой мы узнаем действительных владельцев электростанции. К тому же, по письму, которое писал Б. Хейн предпринимателю Ильмеру, становится известно, что эти господа были не только владельцами электростанции, но и занимались поставками двигателей на новые промышленные предприятия города. Вот текст письма: “Полоцк. Витебская губ. Ноября 26 дня 1913 года.// Г-ну Ильмеру!// Так как Вы до сих пор // не являетесь за мотором и // так как у нас имеется // абонент на односильный // мотор, мы просим Вас непре - // менно зайти иначе мотор пере - // дастся другому, без обратного возврата задатка”. (**КП15-12515**)

Кроме этих предприятий, в городе имелся ряд более мелких: 3 небольшие водяные мельницы на р. Полота (мельница Бондарева (теперь на том месте мост через р. Полоту на Октябрьской улице)); ксаверьевская мельница, принадлежавшая Спасскому монастырю и сдававшаяся в аренду;

гамернская мельница, бывшая во владении частного лица, и также сдававшаяся в аренду (название мельницы происходит от названия небольшого медного завода, который назывался Гамерня, и выпускал медную посуду посредством этой мельницы), 2 небольших кирпичных завода, винный завод, конфетная фабрика, хлебопекарня, несколько кустарных кожевенных и известковых предприятий, 2 мыловаренных, маслобойный заводы.

К сожалению, нет ни одной открытки с изображением крупных промышленных предприятий Полоцка начала XX века. Но существует одна фотооткрытка, выпущенная неизвестным издателем в 1918 году (**КП5-2513/7**), где запечатлена одна из мельниц – Спасская, которая располагалась ниже самого монастыря. В свое время ее арендовал горожанин Райкин. На снимке хорошо видно деревянное, большого размера, трехуровневое строение мельницы, что говорит о производственной мощности и значении предприятия.

На начало XX столетия, в Полоцке было три вида транспорта: водный, наземный и железнодорожный. Каждый из них в разной степени способствовал экономическому развитию города.

Открытки начала XX столетия являются наилучшими иллюстрациями при рассказе о речном транспорте. Снимки с изображением лодки под парусом выпустили почти все издатели, начиная с Лившица и заканчивая зарубежными сериями. Кроме того, на почтовой карточке издателя Георга Штильке из Берлина, можно увидеть причал из лодок, возле которого пришвартован небольшой пароходик с пассажирами. (**КП5-2513/2**).

Еще в середине XIX столетия ведущую роль в транспортировке грузов играла река Западная Двина. Например, в 1865 году по ней прошло более 13 тысяч плотов /**9**/. Каждый плот складывался из двух "лавов" по 60 метров в длину и около 10 – в ширину. Пятнадцать плотов составляли "гонку", при которой обязательно был особый плот, на котором размещался приказчик, или сам хозяин /**1**/. Полоцк был связан пароходным сообщением с Витебском, Двинском и Дриссой. Каждый день ходили пароходы однотрубные и двухтрубные, плоскодонные, которые имели каюты первого класса и крытые палубы /**15**, ф.1164, оп.5, д.16, л.15/. В конце XIX столетия из Витебска до Двинска с заходом в Полоцк курсировали 7 пароходов: "Гигант", "Атлет", "Надежда", "Герой", "Силач", "Борец", и "Друя", – маршруты принадлежали господам З. Гиндину и Л. Рахмилевичу /**1**,**8**,**10** /. С течением времени речной транспорт начинает использоваться не для дальних перевозок, а только для местных рейсов и связи разных частей Полоцка (район Задвинья с Нижним Рынком). /**13**/

Развитие железнодорожного транспорта стало толчком для развития экономики, увеличения грузооборота и перевозок в Полоцке. Риго-

Орловская железная дорога являлась одной из первых дорог во времена императора Александра II. Она была построена на средства частных предпринимателей во главе с лондонскими банкирами Фрулингом и Геменем. /**2**/ Первый пассажирский поезд из Двинска (теперь Даугавпилс) в Полоцк прошел 24 мая 1866 года, путь составлял 151 версту. Другой участок от Полоцка до Витебска, составлявший 94,8 версты, был открыт 06.10.1866 года. В это время паровозное депо Полоцка было укомплектовано маломощными паровозами Путиловского завода.

В начале XX столетия владелец писчебумажного магазина Лившиц в одной из серий своих открыток издал карточку с изображением Николаевского вокзала со стороны главного входа (**КП5-2536/5**), возле которого запечатлены, видимо, важные персоны города. Николаевский железнодорожный вокзал был построен на северо-восточной окраине Полоцка. В здании были размещены залы ожидания первого, второго и третьего классов, багажные и билетные кассы, телеграф, служебные помещения. /**1**/ Между Николаевским и Риго-Орловским вокзалами была соединяющая линия, по которой ходили передаточные паровозы. Риго-Орловский вокзал в то время еще назывался Полоцк-1, находился в районе современного авто- железнодорожного вокзалов. Начальником станции в 1910 году был А.Н. Орлов. Николаевский вокзал также имел еще одно название – Полоцк-2, находился в 2-х верстах от города. Позже этот вокзал стал станцией Громы. Начальник станции в 1910 году – А.Х.Чоглов. Здание вокзала было разрушено во время Великой Отечественной войны.

В 1907 году были открыты железнодорожные отношения из Бологого через Невель и Полоцк на Седлец, которые имели стратегическое значение, так как соединяли г. Санкт-Петербург с Польшей. /**5**/ В связи с этим через реку Западную Двину был построен мост. Снимок моста можно увидеть на открытках, изданных Лившицем и Сувориным, где на мосту видны два сцепленных паровоза (**КП5-2536/1**, **КП6-2827/17**).

Кроме железной дороги в Полоцк вела грунтовая Катерининская дорога /**10**/. Внутригородской транспорт состоял из несколько десятков извозчиков, в 1906 году их количество приближалось к 100. Было несколько “бирж” или стоянок, которые размещались на перекрестках улиц, перпендикулярных главной Витебской (Александровской) улице. Летом ездили в фаэтонах, имевших три места (одно на откидной лавке), с откидным кожаным верхом, с двумя свечными или масляными фонарями. /**3**/ Фрагмент такого фаэтона можно увидеть на открытке, изданной Лившицем, с изображением церкви в Струни (**КП6-2976**, **КП6-2978**). Извозчики имели

свою форму: синий кафтан, красный кушак и особенный лакированный головной убор в виде котелка особой формы /**3**/. Простые крестьяне приезжали на рынок на телеге, в которую был запряжен один конь. Их нехитрое снаряжение хорошо видно по ряду открыток с изображением Красного моста или рыночной площади (**КП15-13520**, **КП15-13521**).

Зимой ездили на санях. Чтобы представить себе, как выглядели такие сани и само передвижение, достаточно взглянуть на почтовую открытку, изданную Ф. Краускопфом из Кенигсберга, где вдоль берега, по льду реки Западной Двины, движутся сани с ездоками. (**КП9-5592/5**) Легкие двухместные сани, предназначенные для перевозки городских пассажиров, имели закрытые борта, а иногда и специальный меховой полог, покрытый бархатом. Санной дорога традиционно считалась с середины декабря до середины марта – на протяжении трех месяцев. /**5**/

Отличительной особенностью Полоцка было его размещение на двух берегах рек: Западной Двины и Полоты. Кроме вышеописанного железнодорожного моста через Двину, другого, на начало XX столетия, не существовало. Через Полоту был только один транспортный мост, известный под названием Красный Мост. Построенный из дерева, в темный период суток он освещался керосиновыми фонарями. Это хорошо видно на открытке, выпущенной издателем Рафайловичем из Полоцка (**КП15-13520**).

Открытки со снимками улиц Витебской, Спасской, изданы Фрицом Краускопфом (**КП5-2298**, Витебская ул.) и А.С. Сувориным (**КП16-16198**, **КП17-17855**). На ул. Витебской посетители города имели возможность останавливаться в одной из трех гостиниц: “Виленской”, “Славянской”, “Гранд-отеле”, принадлежавших Бакаеву /**15**, ф.1164, оп.5. д.16, л. 40/. Кроме гостиниц были мебелированные комнаты, которые также носили звучные названия : “Лондон”. “Бристоль”, “Париж” и др. /**7**/ Кроме этого на Спасской улице были заезжие дома М. Пиетровича и Ицыка Миндлина. /**1**/ Тут можно было поставить экипаж, коня. Всего насчитывалось четыре таких дома, они размещались в районе базаров и на выезде из города. /**15**, ф. 1164. оп.5. д.16. л. 40/

Значительное место в экономической жизни города занимала торговля. В 1897 году в торговле было занято более 26,2% населения. /**12**/ От общего количества торговцев более половины занималось торговлей сельскохозяйственными товарами. Около 130 человек – лесом, строительными материалами, более чем 200 человек – промышленными товарами. /**9**/ Бойкая розничная торговля велась в центре города. С течением времени возрасло число небольших лавок и ларьков. Если в 1860 году было 122 мелких лавки, то уже в 1865 году их численность увеличилась до 456. В дальнейшем рост этих мелких торговых точек сократился, но стали появляться большие магазины по продаже промышленных товаров. /**9**/

Важное место в городской торговле занимали рынки, которые отличались своей специфической специализацией. По Витебской улице размещался Сенной базар, по Плиговской улице – Дровяной базар, а за Красным мостом, по Рижской улице, скотный базар /**15**, ф.1164. оп.5. д.19, л.161/. Центральное место занимал Верхний рынок, где размещались типовые для России каменные торговые ряды, построенные во времена управления Николая I (снесены в 1930-х годах). Строения рынка достаточно выразительно видны на открытках Фрица Краускопфа, которые запечатлели стоянку запряженных в повозки лошадей, мужчин в повседневной одежде. На переднем плане крестьянка с корзинами картошки. (**КП1-261**) На рынке можно было приобрести зерно, муку, скобяные изделия, иконы и церковный инвентарь, обувь, книги. Верхний рынок располагался на месте, где теперь сквер перед кинотеатром "Родина" и до здания Полоцкого отделения национального банка. За Верхним рынком разворачивался Нижний рынок (теперь на том месте Почта и жилой дом с магазином "Юбилейный"), который складывался только из деревянных торговых рядов, где продавали мясные продукты, рыбу, грибы, мед, картофель, посуду. На площади между Верхним и Нижним рынками, были размещены деревянные лавки и столы с дешевыми конфетами, пряниками, баранками, галантереей. Тут же было отведено место и для повозок. /**3**/

Рынки не были единственным местом, где можно было приобрести необходимый товар. Самой торговой улицей была Витебская улица. Тут размещались магазины, фотографии Берманта Ю.Р. и Бернштейна, типографии Х. Клячко и М. Сролиовича. /**6**, **10**/ Кстати, фотография Берманта размещалась в доме уже известного нам Б. Хейна, того, который являлся совладетелем Электростанции. Улица Витебская проходила через Верхний рынок с хлебными лавками, скобяными изделиями, и тянулась до Сенного рынка. Тут же находились "книжные магазины и библиотеки для чтения" /**10**/ М. Лившица и Гофеншефера, М.Е. Екатовой. На открытках начала XX столетия можно увидеть общий вид Витебской улицы с двухэтажными каменными строениями (**КП17-17855**). На других улицах были небольшие лавки и мастерские. Мануфактурный магазин Минца вел оптовую торговлю, давал кредиты мелким торговцам-евреям. Нужно отметить, что большинство торговых точек принадлежала именно им. Среди торговцев-христиан можно назвать братьев Шпаков, один из которых содержал магазин скобяных и железных изделий, торговал ружьями и револьверами, а другой содержал винный магазин; колбасный магазин принадлежал предпринимателю Гуще, мясная и сальная торговля осуществлялась Киселевым и

Мироновым, кондитерскими изделиями торговал Лисовский. Приобрести качественную мебель можно было в салоне Богданова /**15**, ф.1164. оп.5, д. 16, л. 12/. Оптовая и розничная торговля обувью велась купцом Шлосбергом, галантерейный ассортимент имели многие магазины, часть которых принадлежало Курляндскому и Кацу. Посуду можно было купить в магазине Буйницкого. Большой книжный магазин принадлежал купцу Гофеншеферу, который обеспечивал всех учащихся города учебниками и письменными принадлежностями, сумками и ранцами /**15**. ф.1164. оп.5. д.16. л.12/. Этот же предприниматель занимался и выпуском открыток с видами города.

Таким образом, Полоцк начала XX столетия представлял собой средний по уровню экономического развития уездный город, в котором утверждались новые буржуазные отношения. И открытки, как ценный иллюстративный материал, помогают нам увидеть, как это было.

**Литература**

1. **Арлоў У.А.** Таямніцы полацкай гісторыі. Мн.: Беларусь, 1993.

2. **Архітэктура Беларусі**: Энцыкл. даведнік/ Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. Мн.: БелЭн, 1993.

3. **Дейнис И.П.** Полоцк в XX веке ( 1905-1967)/ НПИКМЗ **КП5-2774**.

4. **Документы и матерриалы по истории Белоруссии** (1900-1917). Т.3./ Под ред. В.Н. Перцева. Мн.: 1953.

5. **Жучкевич В.А.** Дороги и водные пути Белоруссии: Историко-географические очерки. Мн.: Изд-во БГУ, 1977.

6. Зональный государственный архив г. Полоцка.(ЗГАП), Ф.1164, воп.1, д. 7,21; Ф. 1164, воп. 5, д.16,19.

7. **Орлов В.А.** Был в Полоцке – “Лондон” и в Минске – “Париж”// Дело (Восток+Запад). 1996, № 6. – с. 62-63.

8. **Подлипский А.Н.** “Посети его – и ты сразу станешь молод…”// Народное слово. 1999, 22 верасня.

9. **Полоцк: Исторический очерк.** 2-е изд. Мн.: Наука и техника, 1987.

10. **Путеводитель по городу Полоцку.** Полоцк: Типография Х.В. Клячко, 1910.

11. **Список населённых мест Витебской губернии.** / Под ред. А.П. Сапунова . Витебск, 1906.

12. **Шыбека З.В.** Гарады Беларусі ( 60-я XIX-пач. XX ст.). Мн.: Эўрафорум, 1997.

13. **Экономика Белоруссии в эпоху империализма.** Мн.: Изд. АН БССР, 1963.

# Агляд калекцый, каталогі прадметаў з фондаў НПГКМЗ

# Беларускія выданні на рускай мове к. XIX – пач. XX стст. у фондах НПГКМЗ

***В.Я. Ашуева***

Каталог выданняў на рускай мове з'яўляецца часткай каталога беларускіх выданняў к. XIX – пач. XX стст. і ўключае кнігі і брашуры, якія выходзілі на тэрыторыі Беларусі і ілюструюць пэўны этап у гісторыі беларускага кнігадрукавання.

Бібліяграфічнае апісанне ў каталогу складаецца з наступных частак: а) аўтар, назва; б) месца выдання, выдавецтва, друкарня, год выхаду; в) колькасць старонак; г) склад выдання паводле зместу; д) захаванасць, наяўнасць пячатак, надпісаў; е) уліковы нумар.

Усе апісанні размешчаны ў алфавітным парадку паводле прозвішчаў аўтараў або назваў кніг. Апісанні кніг прыводзяцца з захаваннем правапісу арыгінала, а заўвагі і каментарыі - на беларускай мове.

1. **Акты, издаваемые археографическою коммиссіею, высочайше учрежденною въ Вильне.** Томъ II. Акты Брестскаго земскаго суда. Вильна, 1867. 374 с.

*Склад*: 1) Предисловіе, с. III-X; 2) Акты, проясняющіе элементъ православія въ Северо-Западномъ крае, с. 1-122; 3) Акты, относящіеся къ администраціи Северо-Западнаго края, с. 125-203; 4) Акты Юридическіе, с. 207-361.

**ПИАЗ КП-8 4802**

2. **Акты, издаваемые Виленскою археографическою коммиссіею.** Томъ XVI. Документы, относящіеся къ исторіи церковной уніи въ Россіи. Вильна. Типографія А.Г. Сыркина. 1889. 852 с.

*Склад*: 1) Оглавленіе XVI-го тома, с. III-XIV; 2) Предисловіе, с.XV-CXLII; 3) Документы, относящіеся къ исторіи церковной уніи въ Россіи, с. 1-666; 4) Указатель личныхъ именъ, с. 667-686; 5) Указатель географическихъ названій, с. 687-704; 6) Опечатки, с. 705; 7) Изданія Виленской археографической коммиссіі, с. 708.

На шмуцтытуле надпіс шарыкавай ручкай сіняга колеру: "Кнігу перадала мне жонка профэсар/а/ Савіча Савіч і усярэдзіне XX ст. лічыў уніяцтва нячыстай сілай і колькі мог стараўся скампраметаваць яе. Улашчык."

**ПИАЗ КП-4 2084**

3. **Андреевъ Ф.** Современное положеніе вопроса о воздухоплаваніи въ примененіи его къ военному делу. Гродно. Паровая типографія К. Крамковского. 1912. 178 с.

*Склад*: 1) Вступленіе, с. 3-4; 2) Введеніе, с. 5-11; 3) асн. змест, с. 11-176; 4) Оглавленіе, с. 177.

На пярэднім форзацы штамп : "Могилевское реальное училище". На тытуле ў левым верхнім вуглу – "Могилевская Государственная Публичная Библиотека"; унізе злева – "Проверено" і надпіс чарнілам "47 г."; у правым ніжнім вуглу (а таксама на с. 17) – "Могилевская областная библиотека им. Ленина" і памета чарнілам: "Пр. 1954".

**ПИАЗ КП-4 2141**

**4. Базарныя цены. Сентябрь – Октябрь 1914 года.** Выпускъ II. Оценочно-статистическій отделъ Минской губернской земской управы. Минскъ. Электро-типографія Я.А. Гринблата. 1914. 44 с.

Выданне змяшчае табліцы з цэнамі на прадукты ў розных населеных пунктах (с. 2-33), сярэднімі цэнамі па паветах (с. 34-37) і платай за правоз грузаў (с. 38-44).

На тытуле штамп: "Государственная библиотека СССР им. В.И.Ленина".

**ПИАЗ КП-7 3682/9**

**5. Базарныя цены за Ноябрь – Декабрь 1914 г. и Краткій обзоръ ценъ на продукты въ Минской губ.** Выпуск III. Оценочно-статистическій отделъ Минской губернской земской управы. Минскъ. Электро-типографія Я.А. Гринблата. 1914. 72 с.

*Склад*: 1) Оглавленіе, с.2; 2) Таблицы: а) Базарныя цены во второй половине ноября и декабря 1914 года въ Минской губерніи, с. 4-35; б)Среднія поуездныя цены на продукты въ ноябре и декабре, с. 36-39; в)Плата за провозъ по шоссейнымъ и грунтовымъ дорогамъ, с. 40-45; 3)Текстъ: Краткій обзоръ ценъ на продукты въ 1941 году въ Минской губ., с. 47-70.

На тытуле (а таксама с. 2) штамп: "Государственная библиотека СССР им. В.И. Ленина".

**ПИАЗ КП-7 3682/10**

**6. Белорусскіе народные разсказы.** Сочиненія Іосифа Даниловича Орловскаго. Томъ I. Полоцкъ. Типографія Н.А. Сроліовича. 1908. 94 с.

*Склад*: 1) Предисловіе, с. 3-4; 2) Старшина и соседъ его Агапонъ, с.5-6; 3) Не Старшина, с. 7-9; 4) Кумъ Замойдавецъ, с. 9-10; 5) Чароуникъ повесіуся, с. 10-12; 6) Платонъ, с. 12-14; 7) Прохоръ, с. 14-15; 8)Два мужика въ лесу на дровосеке, с. 15-18; 9) Тимоха, с. 18-20; 10) Панъ и мужикъ, с. 20-22; 11) Логинъ, с. 22-23; 12) Два старыхъ Мужика. Апанасъ и Прокопъ, с. 23-28; 13) Карпека, с. 28-29; 14) Батька, с. 29-30; 15)Спиридонъ

и Михей, с. 30-34; 16) Старики Пахомъ и Максимъ, с.34-36; 17) Денисъ, с.36-37; 18) Старшина и суседъ его Лукъянъ, с.37-38; 19)Панъ и мужикъ, с. 39; 20) Два мужика. Степанъ и Парамонъ, с. 40; 21) Пилипъ, с.40-42; 22) Сельскій Староста и соседъ его Матей, с. 42-45; 23) Старосто, с. 45; 24) Священникъ и Кумъ съ кумой, с. 45-47; 25)Докторъ и мужикъ, с. 47-49; 26) Дядька и племянникъ, с. 49-50; 27)Старый солдатъ и мужикъ Власъ, с. 50-52; 28) Старикъ и нищій, с.52-53; 29) Батька и сынъ, с. 53-55; 30) Шляхтицъ и мужикъ, с. 55-58; 31)Мужицкая беседа, с. 58-60; 32) Демка и Баутрукъ, с. 60-61; 33) Тарасъ, с.61-63; 34) Архипъ, с. 63-64; 35) Вавила, с. 64-65; 36) Епифанъ, с. 66; 37)Исакъ, с. 66-67; 38) Тимоха, с. 67-68; 39) Артамонъ, с.68-70; 40) Харитонъ, с.70-71; 41) Тумашъ, с.71-42; 42)Швецъ пьяница, с.72-74; 43) Два мужика, с.74-75; 44) Амельянъ, 75-76; 45) Сенька, с.76-77; 46) Ивановская ночь, с. 77-78; 47) Два мужика Максимъ и Барисъ, с. 78-79; 48) Язепъ, с. 79-80; 49) Лесникъ, с. 80-81; 50) Трахимъ, с. 81-82; 51) Марка, с. 82-83; 52)Молодая удова, с. 84-85; 53) Старый Тихонъ, с. 85-86; 54) Хозяинъ, с. 86-87; 55) Наша житье горкое, с. 87-88; 56) Кондратъ, с. 88-89; 57)Прокопъ, с. 80; 58) Антипъ, с. 89-91; 59) Богатаго нетъ въ міре, с. 91-92; 60)Хрищенье, с. 93-94.

На тытуле ўверсе штамп: “Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка. Інстытут Беларускае культуры. Бібліятэка”; унізе - “Інв. праверка 1945” , “Урадавая Бібліятэка БССР імя А.М. Горкага” (такія ж на с. 17) і надпіс чарнілам: “Биб. СНК”. На с. 2 пасярэдзіне штамп: “Инв. 1954 г.”

**ПИАЗ КП-4 2147**

**7. Викентьевъ В.П.** Полоцкій Кадетскій Корпусъ. Историческій очеркъ 75-летія его существованія. Полоцкъ. Типографія Х.В. Клячко. 1910. 312 с. (47-48; 121-128; 137-322; 327-396; I-XLIV).

*Склад*: 1) асн. змест, с.47-396; 2) спісы кадэтаў і выхаванцаў ваеннай гімназіі, с.I-XLIV.

Страчаны: пярэдняя покрыўка вокладкі, сс.1-46, 49-120, 129-136, 323-326; фрагменты: верхняга вугла (2,7х5,0 см.), ніжняга вугла (4,5х5,5 см.) – с.47-48; верхняга вугла (10,0х7,0 см.) – с.121-122; ніжняя частка (17,5х17,2см.) – с. 127-128.

